ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

НЯДЗЕЛЯ, 22 СТУДЗЕНЯ 1939 г. № 4 (418)

ЦАНА 20 КАП.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

ПЯТНАЦЦАЦЬ ГОД БЕЗ ЛЕНІНА—ПА ЛЕНІНСКАМУ ШЛЯХУ, ПАД КІРАЎНІЦТВАМ СТАЛІНА

По заветах Леніна

Сёння ўсё прагрэсіўнае чалавецтва адзначае 15-годдзе з дня смерці найвялікшага правадыра працоўных, генія пролетарскай рэволюцыі Владзіміра Ільіча Леніна.

Ленін! Сёння ні ў адной краіне ні адной часткі свету не знойдзецца чалавека, які-б не ведаў альбо не чуў слова «Ленін». Слава Леніна расце разам з ростам магутнасці соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян—СССР, разам з ростам аўтарытэту Комуністычнага Інтэрнацыянала ў масах працоўных капіталістычных краін.

Ленін — гэта СССР, советы, дыктатура пролэтарыята.

Ленін — гэта Комінтэрн, комуністычныя партыі большэвікоў.

Ленін — гэта адзіны інтэрнацыянальны фронт працоўных супроць фашызма і новай імперыялістычнай вайны.

Ленін усюды, дзе сутыкаюцца інтарэсы працы і капітала, інтарэсы эксплаатыруемых і эксплаататараў.

Слова «Ленін» неаддзяліма ад слова «рэволюцыя» і ад слова «соцыялізм», на якой-бы мове яно ні вымаўлялася. Словамі французскага пісьменніка-комуніста Анры Барбюса, Ленін — гэта «той, хто ўвасабляў у сабе ўсю рускую рэволюцыю, той, хто вынасіў яе ў сваім мозгу, падрыхтаваў, ажыццявіў, адратаваў. Ленін, найвялікшы і ва ўсіх адносінах чысцейшы з тварцоў гісторыі; чалавек, больш якога ніхто не зрабіў для людзей».

Ленін — сцяг пролетарскай рэволюцыі ва ўсім свеце, а вучэнне Леніна, ленінізм — яе праграма.

Ленін развіў і паглыбіў вучэнне Маркса і Энгельса аб дыктатуры пролетарыята, распрацаваў стратэгію і тактыку пролетарскай рэволюцыі.

Ленін у жорсткай барацьбе з народнікамі і эканамістамі адстаяў марксізм супроць апартунізма і рэвізіянізма, заснаваў, стварыў і выпеставаў сапраўды рэволюцыйную, марксісцкую партыю рабочага класа — комуністычную партыю большэвікоў.

Ленін злучыў тэорыю в практыкай, соцыялізм — з рабочым рухам, узняў ролю і значэнне тэорыі ў рэволюцыйнай барацьбе.

Ленін адкрыў новую, апошнюю стадыю ў развіцці капіталізма — імперыялізм і абгрунтаваў вучэнне аб рэволюцыйным прарыве ланцуга імперыялістычных дзяржаў у яго найбольш слабым звяне.

Ленін распрацаваў тэзіс аб магчымасці пабудовы соцыялізма ў адной паасобна ўзятай краіне.

Ленін знайшоў ключ для перамогі пролетарскай рэволюцыі над уладай буржуазіі і памешчыкаў — у рэволюцыйным саюзе рабочага класа і біднейшага сялянства, кіруемым партыяй пролетарыята.

Ленін адкрыў форму пролетарскай дыктатуры — Советы рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў.

Сакрэтным чарнілам паміж радкоў медыцынскай кнігі пісаў В. І. Ленін праект праграмы соцыял-дэмакратычнай рабочай партыі Расіі ў 1895 годзе, калі адбываў сваё першае турэмнае зняволенне ў Пецербургу. Не гледзячы на ўсю строгасць і пільнасць царскай паліцыі, праграма В. І. Леніна дайшла да рабочых мас, да фабрык і заводаў, да падпольных марксісцкіх арганізацый прамысловых цэнтраў — Масквы, Іванава-Вознясенска, Тулы, Растова-на-Дану, і ўскраін імперыі — Сібіры, Закаўказзя, Сярэдняй Азіі, Беларусі. Яна паклала першы сур'ёзны пачатак арганізацыі разрозненых соцыял-дэмакратычных груп і шматлікіх «Саюзаў барацьбы» у адзіную рэволюцыйную партыю пролетарыята, абапіраючуюся сваёй дзейнасці на рабочы рух.

Такая партыя была створана. Газета «Искра» — першыя практычныя крокі; кніга «Што рабіць?» — тэарэтычны фундамент партыі, поўны ідэйны разгром апартунізма; лонданскі з'езд 1903 года — прыняцце праграмы і статута РСДРП, вялікае ідэйнае размежаванне рускіх соцыял-дэмакратаў на большэвікоў і меншавікоў; 1905 год — генеральная рэпетыцыя, выпрабаванне сіл пролетарыята, першыя Советы рабочых дэпутатаў; кніга «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм» — філасофская абарона тэарэтычных асноў марксізма і марксісцкай партыі: дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізма, разгром рэвізіяністаў; Пражская канферэнцыя 1912 года — арганізацыйнае афармленне большэвікоў у самастойную партыю, — вось вехі крапатлівай, цярплівай, гераічнай работы В. І. Леніна па стварэнню рэволюцыйнай партыі рабочага класа.

У годы жудаснай рэакцыі царызма, якая лютавала пасля спаду буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі 1905 года. В. І. Ленін і большэвікі не разгубіліся, не адступілі, як многія, а ў глыбокім падполлі паслядоўна і настойліва кавалі будучыя перамогі, згуртоўваючы масы на далейшую барацьбу, растлумачваючы ім прычыны паражэння рэволюцыі і задачы на бліжэйшы час.

А час набліжаўся грозны. Геній Леніна чуў нарастаўшы гул народнага гневу, бачыў варушэнне народных мас. І калі Расія, не паспеўшы яшчэ аправіцца ад паражэння 1904 года на палях Манчжурыі, рынулася ў 1914 годзе ў імперыялістычную вайну за перадзел свету, — Ленін і большэвікі зрабілі ўсё, каб у рэзультаце гэтай вайны навекі пахаваць рускі царызм і рускую буржуазію.

У лютым 1917 года пала самаўладства... Яшчэ праз восем месяцаў хваляй народнага гневу быў змецен буржуазны Часовы ўрад марыянеткі Керэнскага. Адбылася Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя. Расія стала Совецкай соцыялістычнай дзяржавай. На чале яе ўрада сталі Ленін, Сталін, сталі большэвікі, арганізатары і кіраўнікі перамогі.

Ленін з першага дня соцыялістычнай рэволюцыі практычна кіраваў створанай ім Совецкай дзяржавай, заклаўшы асновы яе знешняй і ўнутранай палітыкі, аснову яе палітычнай магутнасці — рэволюцыйны саюз рабочых і сялян, братні саюз свабодных народаў усіх нацыянальнасцей, аснову яе эканамічнага росквіту — індустрыялізацыю і электрыфікацыю народнай гаспадаркі, аснову яе ваеннай непераможнасці — армію ўзброенага народа, Чырвоную Армію рабочых і сялян.

Па шляху, накрэсленаму Леніным, краіна Советаў, адстаяўшы сябе ў лютых баях са шматлікімі ворагамі, цвёрдай ступою ішла да гаспадарчага аднаўлення і культурнага росквіту. Закладваліся першыя цэглiны ў падмурак велічнага будынка соцыялізма. Перад рабочымі і сялянамі адкрыліся грандыёзныя перспектывы.

І ў гэты момант памёр Владзімір Ільіч... Партыя, рабочы клас, Комуністычны Інтэрнацыянал страцілі свайго адданейшага сына, настаўніка, правадыра.

Але не дрогнулі рады байцоў вялікай арміі соцыялізма. Не пахіснулася мужная партыя большэвікоў-ленінцаў. Над вялікім прахам правадыра ўстаў І. В. Сталін — загартаваны большэвік, лепшы вучань, першы памочнік і баявы саратнік В. І. Леніна.

Сталін! Ен прайшоў разам з Леніным гераічны шлях падполля, барацьбы з царызмам, узброенай барацьбы за ўладу Советаў. Ен разам з Леніным каваў перамогі Вялікага Кастрычніка, кіраваў дзяржавай пролетарскай дыктатуры, будаўніцтвам соцыялізма.

Над вялікім прахам правадыра ўстаў І. В. Сталін і ад імя партыі, ад імя совецкага народа, ад імя Комуністычнага Інтэрнацыянала даў клятву верна і непахісна выконваць заветы Владзіміра Ільіча Леніна:

Трымаць і захоўваць у чыстаце вялікае званне члена партыі.

Захоўваць адзінства нашай партыі, як зяніцу вока.

Захоўваць і ўмацоўваць дыктатуру пролетарыята.

Умацоўваць усімі сіламі саюз рабочых і сялян.

Умацоўваць і пашыраць Саюз Рэспублік, братні саюз усіх нацыянальнасцей.

Умацоўваць і паляпшаць Чырвоную Армію і Чырвоны Флот.

Быць вернымі прынцыпам Комуністычнага Інтэрнацыянала.

Выконваючы заветы вялікага правадыра, наша краіна пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў з поспехам пабудавала соцыялізм і ўступіла ў паласу пабудовы комуністычнага грамадства.

Сталін — лепшы пры Леніне і пасля Леніна кіраўнік марксісцкай партыі большэвікоў-ленінцаў, накіроўваў творчую энергію мас на заваяванне гэтых сусветна-гістарычных перамог. Сталін — і ў практыцы і ў тэорыі варты наступнік і прадаўжальнік справы Маркса—Энгельса—Леніна. Для мільёнаў працоўных у нас і заграніцай «Сталін — гэта Ленін сёння». У гэтым лаканічным крылатым азначэнні Анры Барбюса — глыбокая ісціна, глыбокае марксісцкае разуменне сутнасці сталінскага генія.

Быць такімі, як Ленін, як Сталін — задача кожнага комуніста, кожнага партыйнага і непартыйнага большэвіка, кожнага грамадзяніна нашай краіны. Нам, людзям 30-х год XX стагоддзя, сваімі рукамі пабудаваўшым соцыялістычнае грамадства, прадстаіць яшчэ велізарная барацьба за канчатковую перамогу комунізма ва ўсім свеце. У гэтай барацьбе мы пераможам безумоўна. Але для гэтага патрэбна авалодваць марксісцка-ленінскім вучэннем, ведаць гісторыю большэвіцкай партыі. Для гэтага патрэбна няспынна павялічваць прадукцыйнасць працы, штодзённа павышаць рэволюцыйную пільнасць, умацоўваць дысцыпліну ў радах. «Той, хто адступае цяпер ад парадку дысцыпліны, той пускае ворагаў у сваё асяроддзе» — гаварыў Ленін у 1921 годзе. Гэта ўказанне правадыра набывае асаблівае значэнне сёння, перад тварам нарастаючых баёў супроць фашызма — за комунізм.

Пад кіраўніцтвам Леніна і Сталіна мы пабудавалі соцыялізм. Пад кіраўніцтвам Сталіна і ленінска-сталінскай партыі большэвікоў мы будуем і пабудуем комунізм.

Няхай жыве вялікі, непераможны сцяг Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна!

Няхай жыве ленінска-сталінская партыя большэвікоў!

Няхай жыве ленінізм!.

А. МАРЦІНОВІЧ

ЛЕНІН

Я палячу у марах над планетай,
Акіну поглядам сваім прасцяг...
Хачу я песняй, сонцам абагрэтай,
Уславіць юнасць вечнага жыцця.
Ці хопіць сіл і мудрасці паэта?
...Перада мной віднеецца зямля.
Вось тут раскінуўся наш край Советаў,
Палаюць зоры яркія з Крэмля,
Спяваюць песні вольныя прасторы, —
Нясецца к сонцу ўсенародны гімн.
Пра што мой край у радасці гаворыць?
Пяе ў песнях мой народ аб кім?
Зямля змяніла тут сваё аблічча,
Тут долю ясную працоўны люд здабыў.

У незабыўны год Ільіч вялікім клічам
Падняў народ да слаўнай барацьбы.
То ён павёў тады жалезныя атрады
У агні кастрычніцкіх суровых бур
Знішчаць сляды мінуўшчыны праклятай,

Закладваць новы, непахісны мур.
То ён адкрыў шляхі зняволеным народам,
І ў сэрцы кожнага жыве яго завет.
Як час настане — ў грозныя паходы
Бяссмертны Ленін павядзе сусвет.
А сцягам зорным, вогненна-гарачым
Ужо кліч Леніна высока запалаў.
Таму у роспачы сусвет не плача,
Таму дрыжаць майстры мярзотных спраў.

Таму ў грудзях надзея не згасае.
У тых, што з плеч яшчэ не скінулі ярмо.

Таму цяпер над нашым родным краем
Вясна цвіце і летам і зімой.
Таму гляджу я ў марах на планету,
Дзе кожная раслінка хоча жыць.
І думаю, і веру думам гэтым,
Што нарадзіліся глыбока у душы:
Жывому — вечна жыць. Такі закон прыроды.

І не памрэ жыццё ніколі на зямлі.
І як жыццё, жыць будзе між народаў
Наш неўміручы правадыр Ільіч!

Ал. ШАРАПАЎ

ЛЯ ВЯЛІКАЙ МАГІЛЫ

Зубцоў высокіх лёг адбітак
На плошчу Красную, далей,
Марознай цішынёй спавіты,
Стаіць суровы маўзалей.

Стаіць затканы ўзорам снежным—
Зімы рупліваю рукой,
І строгі строй крэмлёўскіх вежаў
Яго ахоўвае спакой.

Паблісквае халодны мрамар,
На снег адкідваючы цень.
І паўстае ў жалобнай раме
Глыбокай, цяжкай страты дзень,

Калі спіскала болем грудзі,
І скрозь густую мглу завей
Ад сэрца вырываўся к людзям...
Мой першы, мой нясмелы верш.

І вось я зноў у даўнім прошлым,
Далёкія ўстаюць гады:
Са Сталіным ідзе па плошчы
Паходкай спешнай правадыр...

Яго аблічча час не зменіць,
Зіхціць чырвонай ленты шоўк.
Вялікі і любімы Ленін,
Я расказаць табе прышоў.

Усхваляванай шчырай песняй,
Здабытай намі у баю,
Пра родны край—сваё Палессе,
І пра рэспубліку сваю;

Што шлях, паказаны табою,
Ляжыць з канца ў канец зямлі,
Што клятву друга над трупою
Тваёй, як мужнасць, мы няслі;

І ўсё, што ты жадаў народу,
Арлом, што бачыў з ясных гор, —
Соцыялізма небасводам
Радзімы абняло прастор.

Дзе шчасця у жыцці не ведаў
Праклаўшы долю чалавек,
Дзе нашы продкі-караеды
Жылі ў балоце ўвесь свой век, —

Сягоння над шырокай нівай
У новай казцы нашых дзён
Квітнее яваю шчаслівай
Працоўных рук багаты плён.

Гудкамі новых фабрык горда
Уся рэспубліка пяе:
Твой — Леніна пачэсны ордэн
Красуе на грудзях яе:

Твой — Леніна любімы вобраз
У дні будоўлі, у баях
Усмешкаю прыветнай, добрай
Нам асвятляў заўсёды шлях.

У думах, марах ўсіх народаў,
У надзеях кожнага між нас
Гарыць зарою пуцяводнай
Вялікі сталінскі наказ:

Ахоўваючы шчасце наша,
Заўсёды памятай закон —
Як Ленін будзь ў баю бясстрашным,
Няшчадным к ворагам, як ён.

Адкрый, як Ленін, сэрца насцеж
Для тых, хто йдзе з табой ўпярод,
Як Ленін, ў шчасці і ў няшчасці
Любі радзіму і народ.

Мне іншага не трэба шчасця
Як несці к людзям, несці ў свет
Скрозь ўсе нягоды і напасці
Вялікі ленінскі завет.

І жыць з упартаю надзеяй,
Што ў свой апошні, смертны дзень
Жыццё на мрамар маўзалея
Маленькай кропляй упадзе.

З рускай мовы пераклаў
Ц. КРЫСЬКО.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ВЫСТАЎКІ „ЛЕНІН І СТАЛІН— АРГАНІЗАТАРЫ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ“

10 студзеня пад старшынствам нам. старшыні Соўнаркома БССР тав. Кулагіна адбылося першае пасяджэнне выставачнага камітэта мастацкай выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці», прысвечанай 20-годдзю вызвалення БССР ад белапалякаў.

Выстаўком ухваліў прадстаўленыя Упраўленнем па справах мастацтваў дагаворы, заключаныя з мастакамі на выкананне работ да выстаўкі, прапанаваў Упраўленню канкрэтызіраваць змест тэм і прадставіць іх на чарговае пасяджэнне для абмеркавання.

Сакратару выстаўкома тав. Зайцаву даручана прадставіць да чарговага пасяджэння праект прымацавання членаў выстаўкома да мастакоў, а таксама патрабаваць ад Упраўлення па справах мастацтваў спіс работнікаў, якія могуць рэгулярна наведваць мастакоў на-даму і аказваць ім неабходную дапамогу.

Начальніку Упраўлення па справах мастацтваў тав. Озёрскаму разам з тав. Зайцавым даручана прадставіць на зацвярджэнне календарны план рабочых пасяджэнняў выстаўкома, прысвечаных выключна прагляду эскізаў, і разаслаць гэты план усім мастакам. Прагляд усіх эскізаў вырашана закончыць 15 красавіка 1939 года.

Выстаўком ухваліў рашэнне Упраўлення па справах мастацтваў аб арганізацыі дыпломных работ у Віцебскім мастацкім вучылішчы па тэматычнаму плану надыходзячай выстаўкі. Разам з тым выстаўком паставіў перад Упраўленнем па справах мастацтваў задачу — вылучыць разам з Палітупраўленнем БАВА прафесіяналаў-мастакоў, якія знаходзяцца на службе ў Чырвонай Арміі, улічыць іх і, у выпадку неабходнасці, склікаць спецыяльную нараду ваеннаслужачых мастакоў-прафесіяналаў па пытанню аб іх удзеле ў выстаўцы.

Выстаўком вырашыў таксама паставіць пытанне аб забеспячэнні мастакоў, ткачых і вышывальшчыц неабходнымі матэрыяламі для работы (фарбы, палатно, ніткі, інструменты, кісці).

Дырэктару Дома народнай творчасці БССР тав. Рубенчык даручана распрацаваць рад мерапрыемстваў, звязаных з максімальным прыцягненнем удзельнікаў мастацкай самадзейнасці да выстаўкі. Перад Саюзам совецкіх мастакоў пастаўлена пытанне аб арганізацыі шэфства вопытных мастакоў-прафесіяналаў над паасобнымі растучымі, праявіўшымі сябе на мастацкай рабоце мастакамі-самавучкамі для аказання ім практычнай дапамогі.

Выстаўком вырашыў звярнуцца з просьбай да Маскоўскага абласнога саюза совецкіх мастакоў аб аказанні братняй дапамогі беларускім мастакам.

Вырашана стварыць пры выстаўкоме групу кансультантаў, як па пытаннях гісторыка-палітычных, так і спецыяльных. Для аказання дапамогі мастакам прыцягваецца таксама Музей рэволюцыі і Дзяржаўная бібліятэка імя Леніна. Вырашана звярнуцца з просьбай да Усесаюзнага музея імя Леніна ў Маскве аб аказанні беларускім мастакам практычнай дапамогі ў іх рабоце шляхам арганізацыі экспертыз, кансультацый, прадстаўлення гістарычных дакументаў і матэрыялаў.

Зацверджан Мастацкі совет пры выстаўкоме ў складзе тт Зайцава (старшыня), засл. дзеячаў мастацтваў праф. Юона, Керзіна і Азгура і тт. Волкава, Манасзона, Рубінштэйна, Геніна, Клімава, Гракава. Упаўнаважанымі выстаўкома ў абласцях зацверджаны начальнікі абласных аддзелаў мастацтваў — Уханаў, Саламонік, Кац і Любамірскі.



ЛЕНІН АБ КУЛЬТУРЫ, ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВЕ

«Гісторыя рабочага руху ўсіх краін паказвае, што раней за ўсё і лягчэй за ўсё ўспрымаюць ідэі соцыялізма найлепш пастаўленыя слаі рабочых. З іх галоўным чынам бяруцца тыя рабочыя-перадавікі, якіх вылучае ўсякі рабочы рух, рабочыя, умеючыя набываць поўнае давер'е рабочых мас, рабочыя, якія прысвячаюць сябе цалкам справе асветы і арганізацыі пролетарыята, рабочыя, якія ўпаўне свядома ўспрымаюць соцыялізм і якія нават самастойна выпрацоўвалі соцыялістычныя тэорыі. Усякі жыццёвы рабочы рух вылучаў такіх правадыроў рабочых, сваіх Прудонаў і Вальянаў, Вейтлінгаў і Бебеляў. І наш рускі рабочы рух абяцае не адстаць у гэтых адносінах ад еўрапейскага. У той час, калі адукаванае грамадства траціць цікавасць да чэснай, нелегальнай літаратуры, сярод рабочых расце страснае імкненне да ведаў і да соцыялізма, сярод рабочых вылучаюцца сапраўдныя героі, якія — не гледзячы на агідныя абставіны свайго жыцця, не гледзячы на атупляючую катаржную работу на фабрыцы, — знаходзяць у сабе столькі характару і сілы волі, каб вучыцца, вучыцца і вучыцца і выпрацоўваць з сябе свядомых соцыял-дэмакратаў, «рабочую інтэлігенцыю». У Расіі ўжо ёсць гэта «рабочая інтэлігенцыя», і мы павінны прыкласці ўсе намаганні к таму, каб яе рады пастаянна пашыраліся, каб яе высокія разумовыя запатрабаванні ўпаўне задавольваліся, каб з яе радоў выходзілі кіраўнікі рускай соцыял-дэмакратычнай рабочай партыі. Тая газета, якая хацела-б стаць органам усіх рускіх соцыял-дэмакратаў, павінна стаяць пагэтаму на ўзроўні перадавых рабочых; яна не толькі не павінна штучна паніжаць свайго ўзроўню, а, насупраць, заўсёды узнімаць яго, сачыць за ўсімі тактычнымі, палітычнымі і тэарэтычнымі пытаннямі сусветнай соцыял-дэмакратыі. Толькі тады запатрабаванні рабочай інтэлігенцыі будуць задавольвацца, і яна сама возьме ў свае рукі рускую рабочую справу, а, **значыць**, і рускую рэволюцыйную справу».

«Понятное направление в русской социал-демократии», т. II, стар. 552—553.

⁂

«Марксізм заваяваў сабе сваё сусветна-гістарычнае значэнне як ідэалогіі рэволюцыйнага пролетарыята тым, што ён, марксізм, ані не адкінуў каштоўнейшыя заваёвы буржуазнай эпохі, а, насупраць, засвоіў і перапрацаваў усё, што было каштоўнага ў больш чым двухтысячагадовым развіцці чалавечай мыслі і культуры. Толькі далейшая работа на гэтай аснове і ў гэтым-жа напрамку, адухатвараемая (практычным) вопытам дыктатуры пролетарыята як апошняй барацьбы яго супроць усякай эксплуатацыі, можа быць прызнана развіццём сапраўды пролетарскай культуры».

«О пролетарской культуре», «проект резолюции», 1920 год, т. XXV стар. 409.

«...**Ролю перадавога барацьбіта можа выканаць толькі партыя, кіруемая перадавой тэорыяй.** А каб хоць колькі-небудзь канкрэтна ўявіць сабе, што гэта азначае, няхай чытач успомніць аб такіх папярэдніках рускай соцыял-дэмакратыі, як Герцэн, Белінскі, Чэрнышэўскі і бліскучая плеяда рэволюцыянераў 70-х год; няхай падумае аб тым сусветным значэнні, якое набывае цяпер руская літаратура; няхай... ды даволі і гэтага!»

«Что делать?», 1901 год, т. IV, стар. 380.

⁂

«Ці чуждае нам, вялікарускім свядомым пролетарыям, пачуццё нацыянальнай гордасці? Вядома, не! Мы любім сваю мову і сваю радзіму, мы больш за ўсё працуем над тым, каб **яе** працоўныя масы (г. зн. 9/10 **яе** насельніцтва) узняць да свядомага жыцця дэмакратаў і соцыялістаў. Нам балюча за ўсё бачыць і адчуваць, якім гвалтам, гнёту і здзекам падвяргаюць нашу цудоўную радзіму царскія каты, дваране і капіталісты. Мы ганарымся тым, што гэтыя гвалты выклікалі адпор з нашага асяроддзя, з асяроддзя вялікарусаў, што **гэта** асяроддзе вылучыла Радзішчэва, дзекабрыстаў, рэволюцыянераў-разначынцаў 70-х год, што вялікарускі рабочы клас стварыў у 1905 годзе магутную рэволюцыйную партыю мас, што вялікарускі мужык пачаў у той-жа час станавіцца дэмакратам, пачаў звяргаць папа і памешчыка».

«О национальной гордости великороссов». 1914 год, т. XVII, стар. 81.

⁂

«Ушаноўваючы Герцэна, пролетарыят вучыцца на яго прыкладзе вялікаму значэнню рэволюцыйнай тэорыі; — вучыцца разумець, што беззаветная адданасць рэволюцыі і зварот з рэволюцыйнай прапаведдзю да народа не знікае нават тады, калі цэлыя дзесяцігоддзі аддзяляюць пасеў ад жатвы; — вучыцца вызначэнню ролі розных класаў у рускай і міжнароднай рэволюцыі. Узбагачаны гэтымі ўрокамі, пролетарыят праб'е сабе дарогу да свабоднага саюза з соцыялістычнымі рабочымі ўсіх краін, раздавіўшы тую гадзіну, царскую манархію, супроць якой Герцэн першы ўзняў вялікі сцяг барацьбы шляхам звароту да мас з **вольным рускім словам**».

«Памяти Герцена», 1912 год, т. XV, стар. 469.

⁂

«Як дзекабрысты абудзілі Герцэна, так і Герцэн і яго «Колокол» дапамаглі прабуджэнню разначынцаў, адукаваных прадстаўнікоў ліберальнай і дэмакратычнай буржуазіі, належаўшых не да дваранства, а да чыноўніцтва, мяшчанства, купецтва, сялянства. Папярэднікам поўнага выцяснення дваран разначынцамі ў нашым вызваленчым руху быў яшчэ пры прыгонным праве В. Г. Белінскі. Яго славутае «Пісьмо к Гогалю», якое падводзіла вынік літаратурнай дзейнасці Белінскага, было адным з лепшых твораў бесцэнзурнага дэмакратычнага друку, што захавалі велізарнае, жывое значэнне і па гэты час».

«Из прошлого рабочей печати в России». 1914 год, т. XVII, стар. 341.

НЯСЕ НАРОД, ЯК СІМВАЛ ПЕРАМОГІ, ЛЕНІНА БЯССМЕРТНАЕ ІМЯ

***



В. І. Ленін і І. В. Сталін гутараць з чырвонагвардзейцамі ў Смольным. 1917 год.
Работа мастака **П. Васільева.** Акварэль. Рапрадукцыя фотахронікі ТАСС.

У ЛЕНІНА

(Яўрэйская народная казка)

... Дык сяляне ўбачылі, што і няўпраўка: касіць трэба, вязаць трэба, складаць снапы трэба, а вазіць, а малаціць, а веяць дзе?.. Жартачкі—жніво! А сонца пячэ. Часу мала. І раптам дождж, як з вядра, і хлеб агніе. І ўсё рукамі. Рабі, як хочаш.

Дык сяляне ўбачылі, што дрэнна: хоць памірай! Цэлая гара работы, а тут — адны, без усякіх машын.

Сяляне думалі, думалі і дадумаліся.

— Да Леніна! — сказалі яны ў адзін голас.

Тут-жа выбралі разумных і паважаных людзей. Наказалі ім так і так. І яны пайшлі ў сталіцу, у Маскву, да самога Леніна.

Прышлі ў Маскву, узяўшы кіі ў рукі і хатомкі на плечы... Што? Пусціліся ў такую дарогу, у такі горад, — ёсці трэба-ж?

— Так, горад. Вялікі горад, багаты горад. Мне здаецца, што з адной Масквы можна зрабіць дваццаць Інгулецаў, — заўважыў адзін.

Ідуць яны адной вуліцай, ідуць другой, людзей — процьма. З усіх бакоў людзі, як у нас на Кастрычніцкае свята: людзі туды, людзі сюды, наперадзе людзі, ззаду людзі. А трамваі, а аўтамабілі... І міліцыянер стаіць на рагу ў белых пальчатках на руках, — гэта ўлетку!..

Прыгожа ў Маскве!

Ідуць яны далей — адной вуліцай, другой, і вось ён — Крэмль.

Сталі яны, і стаяць. Высокая сцява зубчастая, як грэбень, з вежамі да неба.

Стаяць сяляне, абапёршыся на кіі: што цяпер рабіць?

Ехалі праз палі, праз лясы, прайшлі столькі вуліц, а тут — такая сцяна, а па той бок — Ленін.

Але калі сяляне хочуць пагаварыць з Леніным, дык што? Падышлі да шырокай брамы, — а яна такая высокая, што можна-б з арбай з двайнымі драбінамі ўехаць, — кажуць:

— Нішто сабе брама.

— Але. А глядзі, якія ў браме асілкі-чырвонаармейцы стаяць!

Падыходзяць сяляне, а ім насустрач — самы прыгожы і дужы асілак. Бярэ пад казырок.

— Чаго, бацька, жадаеце? — пытаецца ён.

— Мы хочам, — кажуць сяляне, — пабачыць самога.

— О, калі ласка, — кажа самы прыгожы і дужы асілак-чырвонаармеец. — Мы атрымалі загад: калі прыдуць рабочыя ці сяляне, — адразу прапускаць, а ворагаў — затрымліваць.

Пайшлі сяляне, высока падняўшы свае сівыя галовы, як і належыць.

Асілкі-чырвонаармейцы з абодвых бакоў выстраіліся ва фронт.

Ідуць сяляне міма палацаў крышталёвых, міма палацаў мармуровых, міма палацаў дубовых. А ўсё точана, а ўсё пазалочана, а пад нагамі — брук. А тут — звычайны дом з жалезным дахам.

— Тут жыве Владзімір Ільіч, — кажа самы прыгожы і дужы асілак-чырвонаармеец, — уваходзьце.

— Чуеш? У звычайным доме!—дзівяцца сяляне.

— Ён не любіць царскіх палацаў.

Вось, уваходзяць яны ў адзін пакой: светла, чыста, ціха-ціхенечка. Уваходзяць у другі пакой: светла, чыста ціха-ціхенечка.

— Што гэта можа быць, — пытаецца адзін.

— Зразумейце, — кажа самы старэйшы: — калі такая галава думае, павінна быць ціха.

Усе зразумелі.

Адкрылі трэція дзверы: з лаўкі падымаецца сярэдняга росту чалавек, з войстранькай рыжаватай бародкай, з вачамі маленькімі, усміхаючыміся, разумнымі. Бачань усё і ўсміхаюцца.

— Дабро пажалаваць, уваходзьце, — кажа да іх Ленін, і выходзіць з-за стала, і здароўкаецца з усімі: — Сядайце.

Паселі ўсе, аглядаюцца кругом.

Высокія сцены, шкафы, поўныя кніг, а кожная кніга — мыслі мудрацоў, і галава Леніна з высокім ілбом—скарбніца мудрасці.

«Як пачаць і з чаго?» — думаюць.— Жартачкі хіба, — гаварыць з самім Леніным.

— Як на палях?—пытаецца Ленін.— Ці ідуць дажджы?

Пачуўшы такія простыя словы, сяляне падбадзёрыліся, а самы сівы так сказаў:

— Дзякую табе, вялікі правадыр, за прыём і за тое, што цікавішся нашымі палямі і стэпамі. Хлеб узышоў, каласы стаяць — аж зямля гнецца. Нас прывёў да цябе, Владзімір Ільіч, клопат: як зняць ураджай? Рукамі проста немагчыма.

— Чаго-ж вы хочаце, якое ваша жаданне? — пытаецца Ленін.

Яны адказваюць:

— Машын!

— Без машын нам ніяк не ўправіцца, не ўзняцца на ногі, — дадае адзін.

—Правільна, таварышы, — кажа Ленін.—Але па вашых дробных надзелах машыны не пусціш, няма як завярнуцца і няма сэнсу. Вось ты, дзед, колькі зямлі маеш?

— Я з сынам шэсць дзесяцін маю.

— Адным кавалкам? — зноў пытаецца Ленін.

— Не, у шасці месцах.

— Бачыце? — ажывіўся Ленін. — Спачатку арцелі, а затым ужо і машыны.

— Адносна арцелей будзь спакойны, адказваў самы сівы хадок: — калі мы па сотні і па тысячы людзей працавалі на пана ў яго стэпу, дык усе разам мы з радасцю будзем на сябе працаваць.

— Ну, — пытаецца Ленін, — а кулак дасць вам разам рабіць, дасць вам рабіць машынамі, дасць вам зрабіцца заможнымі?

Сяляне пераглядваюцца, пачэсваюць патыліцы, потым самы сівы кажа:

— Па яго зубах відаць, што будзе кусаць.

— Воўк заўсёды сочыць за сваёй афярай, — кажа другі.

— Калі мы ссеклі панскае дрэва, дык выкарчуем і кулацкія карэнні, а то зноў пачне пан расці, — дадае трэці.

— Толькі дапамога, — кажа сівы, — дык вырвем гнілы зуб са здаровага роту.

— Дапамогу партыя і рабочыя акажуць, — адказвае Ленін. — Цяпер гаварыце, якую машыну вам патрэбна?

— Такую-б машыну нам, — кажа сівы, — якая-б касіла, малаціла і веяла.

— Каб машына была кол-бой,—кажа другі.

— Кол-бой і камбайн — гэта адно і тое, — кажа трэці.

— Што тычыцца механікі, машын, — кажа Ленін, — дык мы запросім да нас таварыша Сталіна. Ён кіруе ўмацаваннем краіны, клапоціцца аб яе багацці і шчасці.

Пры гэтым Ленін націснуў кнопку ў сцяне і звон-кліч разнёсся па ўсяму Крэмлю:

— Таварыша Сталіна просяць да сялян!

Як Сталін пачуў, што яго просяць да Леніна, да сялян, — ён адразу з'явіўся.

Ленін кажа яму: так і так.

Адказвае Сталін:

— Няма такой рэчы, якую большэвікі не змаглі-б зрабіць. Хадземце ў зал да інжынераў.

Пайшоў Ленін, пайшоў Сталін, пайшлі сяляне. Ідуць яны, ідуць, пакуль не прышлі да палаца, дзе калісьці цары каранаваліся, каб панаваць над народам.

Там сядзела 77 мудрацоў-інжынераў. Сядзяць сабе ў акулярах і, знай, робяць адно — выдумляюць розныя машыны.

Убачыўшы такіх гасцей, — Леніна, Сталіна, сялян, — інжынеры палажылі свае інструменты.

Сталін сказаў:

— Нам трэба дапамагчы сялянству такой машынай, каб касіла, малаціла і веяла.

— Злучыце жнейку, малатарню і веялку ў адно, — дадае сівы хадок.

— Зрабіце машыну кол-бой, — кажа другі.

Ленін паглядае на сялян, на інжынераў і зноў на сялян. Па-братняму ўсміхаецца. Сталін нешта хутка запісвае ў кніжачку. А сяляне адчуваюць сілу ў нагах, прыемнасць на сэрцы.

Устае старэйшы над усімі інжынерамі і кажа:

— Калі сялянству патрэбна, дык няма чаго і гаварыць. Будзе!

Так і стала.

Запісана ад Мэйшэ Брэйтэр у гор. Інгулец (УССР).
(Пераклад з яўрэйскай мовы).

***

ЖЫВОМУ ЛЕНІНУ

Дзён з таго часу праляцела многа,
Змяніўся край мой за пятнаццаць год:
Пралеглі па дрыгве цяпер дарогі,
Дзе глуш была—глядзіш стаіць завод.

Табе, бяссмертнаму тытану-чалавеку,
Звіла вянок эпоха нашых дзён.
Такіх вянкоў не бачыла спрадвеку
Ніякае з выдатнейшых імён.

Ты сярод нас. Мы крочым за табою
У надхмар'і, па пустынях, па вадзе...
Мы ўсе ідзём адзінаю сям'ёю
І ўсюды нас ты за сабой вядзеш.

Па ўсёй зямлі, ад края і да края,
Па гарадах, прасторамі палёў
Ты ходзіш і народы заклікаеш
Да выязваленчых, праведных баёў.

Ты не памёр, ты плошчаю Чырвонай
Хадой упэўненай ідзеш сярод жывых,
Там, дзе праходзяць мужныя калоны
Байцоў чырвоных, танкаў баявых.

Ці горадам ідзеш, ці нашым полем,
Сярод вясёлых, радасных людзей, —
Любімы Сталін наш з табою поплеч,
З табою поруч па зямлі ідзе.

Ён — гэта ты, наш неўміручы геній,
Ён — наш бясстрашны штурман,
рулявы...
Дзе ён ідзе, там ты, наш бацька Ленін,
Там ты ідзеш жывым сярод жывых!

Мікола Аўрамчык

ПЕСНЯ ПРА СОНЦА

Я лугам ранішнім хадзіў,
Лясамі цёмнымі брадзіў,
Прайшоў наўсцяж усю зямлю,
Пра сонца песню запяю.

Свяціся, сонца, век з Крэмля,
Цвіці, шчаслівая зямля!

Крыніцы светлыя бурляць,
Калгасы працаю кіпяць,
Растуць пшаніцы і аўсы,
Шумяць цяжкія каласы.

Свяціся, сонца, век з Крэмля,
Цвіці, шчаслівая зямля!

Калісьці бацька мой тужыў,
Як пад няволяй панскай жыў.
Цяпер, як я, ён малады,
Гадуе рупліва сады.

Свяціся, сонца, век з Крэмля,
Цвіці, шчаслівая зямля!

Мы права маем жыць, тварыць,
Радзіму светлую любіць.
Не знаем скрухі і тугі,
Сагрэты імем дарагім.

Свяціся, сонца, век з Крэмля.
Цвіці, шчаслівая зямля!

А Беларусь, сястра з сясцёр,
Адна з адзінаццаці зор,
Як кветка, летам і зімой
Красуе сталінскай вясной.

Свяціся, сонца, век з Крэмля,
Цвіці, шчаслівая зямля!..

Г. Няхай

Жылі дзед і баба

(БЕЛАРУСКАЯ ЛЕГЕНДА)

Жылі дзед і баба. І нарадзіўся ў іх сын. Як вырас сын, сталі радавацца старыя, што будзе ім хоць пад старасць падмога.

І вось, пасварыўся аднойчы іхны сын з панамі і кулакамі, і засудзілі яго за гэта, і саслалі ў Сібір. І засталіся зноў дзед і баба гараваць, — няма ім дапамогі.

Баба дзеду кажа:

— Дзедка, з'ездзі хоць у горад.

Паслухаў дзед бабу, сабраў вазок дроў, яечак з поўдзесятка і паехаў.

Ехаў, ехаў — не хоча яго каняка ісці.

Здаганяе дзеда пан на вараным кані, у залатой карэце. Пад'ехаў і зарагатаў:

— Ну, як, дзядуля, паедзем разам да горада?

Дзед адвярнуўся на другі бок і заплакаў:



— Добра табе смяяцца ля дзеда, што дзедаў каняка нэ хоча ісці.

— Трэба лепшага набыць, — кажа пан. — Прыдзі да мяне, парабі лета, дам я табе каня, якога хочаш, і сына твайго вярну. Толькі рабі добра, каб я цябе не лаяў.

Сеў пан і паехаў.

З'ездзіў дзед у горад, прадаў дровы, лечкі, купіў мукі, солі. Прыехаў дамоў; распрагае каня і кажа да яго:

— Ну, гнеды, больш мне на табе не рабіць. Пан дасць мне добрага каня і сыночка верне.

Пачула баба і пытаецца:

— Што ты, дзедка, кажаш?

— Ах, каб ты ведала, што я сёння чуў; душа радуецца. Здагнаў мяне сёння пан на дарозе і кажа: — Прыдзі, кажа, да мяне, парабі лета, дам я табе каня і сынка твайго вярну.

Засмяялася баба:

— Гэта нейкі добры пан, спагадае бедным, — і коніка дае, і сыночка дамоў варочае. Глядзі, во, Марка працаваў у пана цэлае лета, а як прышло да разліку, дык пан прагнаў без грошай, кажа — ты мне яшчэ вінен.

Усё-ткі назаўтра сабраўся дзед і пайшоў да пана. Прышоў, пакланіўся:

— Галубочак, прышоў я да цябе.

Пан паслаў яго на работу і сказаў:

— Рабі, то будзе табе конь і сына вярну.

Прарабіў дзед лета, — і ў хаце не быў. Прышоў да пана за разлікам.

— Ну, галубочак, — кажа дзед,—работа закончана. Як дагаварыліся, трэба разлічыцца, і сыночка майго вярніце.

Пан і кажа:

— Зараз разлічуся. — Выняў запісную кніжку. — Слухай, дзед, прачытаю тваю плату: на полі дрэнна працаваў, памногу еў, коні збіваў, самавольна ў грады лазіў, у маім доме спаў, адзежу маю насіў, па полі маім хадзіў. Лыжкі мае, міскі мае і ўсё маё. За гэта ўсё трэба плаціць, табе нічога не застаецца, ты мне яшчэ вінен.

Дзед паскроб галаву, пашкадаваў, што дарма рабіў лета, на сонцы пёкся. Пачаў супярэчыць:

— Работаў, — каня давай.

Дзеду так набілі бакі, калені, што кроўю падплыў. Ледзь дадому прыцягнуўся.

— Ну, як, дзедка, адрабіўся, а конь дзе? — пытаецца баба.

— Маўчы, баба, не да каня мне. Праўду ты казала: падманіць. Яшчэ ў карак надавалі.

Загаласіла баба, заплакаў і сам дзед, што ідзе зіма, а каня няма, а хлеба няма, а нічога няма.

Пайшоў дзед у лес. Падышоў да кудравай бярозы:

— Скажы, белая бяроза, калі буду добра жыць, на добрым кані рабіць, калі паноў не будзе?

Бяроза яму і адказвае:

— Хутка прыдзе тая часіна, узыйдзе яснае сонца, сярод сонца з'явіцца чырвоная звязда, сярод звязды будзе многа войска, а сярод войска будзе залаты чалавек. І калі ты ўбачыш гэта сонца, бяжы да яго, — гэта сонца беднаты, яно ўсіх тады сабярэ і абагрэе. А войска ўсіх бедных абароніць. Залаты чалавек усіх бедных зямлёй і добрымі конямі надзяляць будзе.

Прышоў дзед дадому і ўсё думае, няўжо гэта ўсё будзе, як казала бяроза. Стаў сярод двара і сам сабе гаворыць:

— Узыйдзе яснае сонца, сярод яснага сонца з'явіцца чырвоная звязда, сярод чырвонай звязды будзе многа войска, а сярод войска будзе залаты чалавек, а гэты залаты чалавек дасць усё бедным людзям. І крыкнуў на ўвесь двор:

— Эх, скарэй, скарэй узыйдзі, краснае сонца!..

І не прыкмячае дзед, што кругом сабралася поўна людзей і слухаюць.

Сталі людзі ў дзеда пытацца, аб чым гэта дзед гаварыў. Дзед і давай усім расказваць...

Вось, у адну ноч усхвацілася бура, нацягнула цёмныя хмары, бліснула маланка, загрымеў і ўдарыў грозны гром і прачнулася ўся грамада, усхваціўся і дзед.



І ўзышло яснае сонца, а сярод сонца з'явілася чырвоная звязда, а сярод звязды — войска незлічонае, а наперадзе войска — залаты чалавек шлях паказвае.

Пабег дзед да таго чалавека. А сярод войска знайшоў свайго роднага сына. Абняліся з ім і з радасці заплакалі. І расказаў сын бацьку, што вялікі чалавек, які вядзе ўсіх, — гэта Ленін, а войска незлічонае, што знішчае паноў, — гэта рэвалюцыя.

Зажыў пасля гэтага па-новаму народ. Зямлі стала многа і ўсякага дабра.

Дзед гэты мае цяпер многа гадоў, але яшчэ моцны і ўсё ўспамінае вялікага Леніна, дзякуе любімаму Сталіну за тое, што пад старасць дачакаўся шчаслівага жыцця.

Запісана ад качагара Кастуся Вальвачова ў в. Лыкава Магілеўскага раёна, 1937 год.

***



Ленін у выяўленчым мастацтве БССР. Владзімір Ільіч Ленін. Партрэт работы мастака В. В. Волкава.



Ленін у выяўленчым мастацтве БССР. Владзімір Ільіч Ленін. Партрэт работы мастака Я. М. Кругера.

ЛЕНІН У ВЫЯЎЛЕНЧЫМ МАСТАЦТВЕ БССР

З імем Леніна на вуснах баец рэспубліканскай Іспаніі ідзе ў атаку на фашысцкага варвара. Імя Леніна падымае на барацьбу з эксплаататарамі працоўных капіталістычных краін. Імем Леніна натхняецца на стаханаўскую працу краіна сацыялізма. Працай і мастацкай творчасцю савецкі народ услаўляе Леніна. Радасць, праца і натхненне, высяпванне хлябоў і светлая ўсмешка савецкага дзіцяці — усё звязана з імем Леніна.

Надзвычай ярка і шматвобразна перададзен вобраз Леніна ў беларускай народнай мастацкай вышыўцы. Беларусь здаўна славілася вышывальным мастацтвам, якое ў савецкіх умовах дасягнула здзіўляючага росквіту. На выстаўках народнай творчасці заўсёды прыцягваюць увагу вышытыя партрэты, кампазіцыі. І трэба сказаць, што некаторыя нашы майстры вышыўкі дасягнулі ў гэтым мастацтве вялікай жывапіснай выразнасці.

Заслугоўваюць увагі работы Х. Кагана, рабочага менскай арцелі вышывальшчыкаў. Яго машынная вышыўка—вынік работы чулага мастака. Ён кладзе нітку на палатно, як жывапісец накладвае мазок на карціну.

Выяўленчыя сродкі жывапісца, вядома, больш разнастайныя і моцныя, чым у вышывальшчыка. Але народ думае і творыць выключна глыбока, таму што ў народзе закладзены багацці вякамі выпрацаванай мудрасці, разуменне вялікай праўды як у самім жыцці, так і ў мастацтве. Вось чаму прафесіянальным мастакам заўсёды трэба вучыцца разуменню праўды мастацтва ў народа і ў вечна жывой народнай творчасці.

З лепшых работ вышывальшчыка Х. Кагана ўкажам на яго кампазіцыі: «Ленін і Сталін у Смольным» і «Ленін вітае войскі, адыходзячыя на белапольскі фронт». Апошняя кампазіцыя зроблена Каганам па вядомай карціне І. Бродскага. Вышывальшчыку ўдалося надаць гэтым кампазіцыям значную выразнасць і праўдзівасць.

У мастацкіх работах па дрэву вялікага майстэрства дасягнуў рабочы завода імя Молатава інкрустатар І. Вольпер. Пры надзвычайнай эканоміі фарбаў, ён умее схапіць асноўны штрых у чалавечым твары, пракласці яго інкрустацыяй па дрэву з чоткасцю графічнага штрыха. Адна з лепшых работ інкрустатара І. Вольпера — барэльеф «Ленін і Сталін».

Народ багат талентамі і гэтыя таленты, разбуджаныя і закліканыя да творчасці Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыяй, свае лепшыя работы — рэзультат творчага натхнення — прысвячаюць вялікаму Леніну.

Не простым дрывасекам ідзе часам у лес калгаснік Бялыніцкага раёна Б. Хрушчоў. Ён ідзе з мыслямі пра Леніна, ідзе як скульптар. Ён вырубае ў лесе бярозу і дома ў часе адпачынку робіць з бярозы скульптурны бюст Леніна. У гэты-ж час у Гомелі пенсіянер Г. Паварыч стварае гіпсавую скульптуру Владзіміра Ільіча. У Барысаве майстры керамічнага мастацтва працуюць над керамічным партрэтам Леніна.

Народ у сваёй творчасці славіць Леніна, чыё імя, як незгасаючае сонца, свеціць усяму працоўнаму чалавецтву.

Неўміручы, вялікі вобраз Леніна натхняе і прафесіянальных мастакоў Савецкай Беларусі.

Шмат працаваў над вобразам Леніна старэйшы мастак БССР Ю. М. Пэн. У радзе ўстаноў, рабочых клубаў, у прыватнасці ў Палацы працы ў Віцебску, ёсць партрэты Леніна работы Ю. М. Пэна. Вялікі майстар кісці, сведка змрочных год царызма, які стварыў дзівосную галерэю сацыяльных партрэтаў, Юрый Майсеевіч Пэн з асаблівым натхненнем працаваў над партрэтамі правадыра працоўнага чалавецтва. Партрэты Леніна работы Ю. М. Пэна вызначаюцца высокім майстэрствам выканання, у іх адчуваецца вялікая і хвалюючая любоў старога мастака да вялікага Леніна.

З іншых мастакоў, працуючых над вобразам Владзіміра Ільіча, варта адзначыць В. В. Волкава. Кампазіцыйны партрэт Леніна работы Волкава, выстаўлены ў зале Акадэміі навук у Менску, можа быць аднесен да ліку лепшых партрэтаў, напісаных беларускімі мастакамі. На партрэце мы бачым Леніна ў яго бібліятэцы. Мастак перадаў на партрэце — у глыбокіх і апеленых мыслю карых вачах — вайстрыню і веліч ленінскага розуму, яго выключную рэвалюцыйную волю.

Шмат працаваў і працуе над вобразам Леніна мастак Я. М. Кругер.

З жывапісных партрэтаў Леніна, выкананых маладымі мастакамі, адзначым партрэт работы Н. І. Гусева, выстаўлены ў Музеі рэвалюцыі БССР. Шмат працуюць нашы мастакі, асабліва маладыя, над партрэтамі Владзіміра Ільіча для масавых народных святаў і дэманстрацый. Выкананне гэтых работ робіць гонар нашым мастакам.

З літаграфскіх партрэтаў трэба адзначыць тры аўталітаграфскія партрэты Владзіміра Ільіча, выкананыя А. М. Бразэрам.

Шырока прадстаўлен вобраз Леніна ў скульптуры. Амаль усе скульптары Савецкай Беларусі працавалі і працуюць над скульптурным партрэтам Владзіміра Ільіча. У ліку лепшых сярод гэтых скульптурных работ — работы заслужаных дзеячоў мастацтваў М. А. Керзіна, А. А. Бембеля, З. І. Азгура і А. В. Грубэ. Керзіным для Дома ўрада выканан бюст Леніна, Бембелем — барэльеф Леніна.

Асобна трэба спыніцца на скульптурнай кампазіцыі Азгура. Скульптар паказаў вялікую дружбу геніяў чалавецтва — Леніна і Сталіна. Ленін у расшпіленым паліто, паклаўшы левую руку на плячо Сталіна, паказвае, правай рукою дарогу ў будучыню. Сталін у паходным шынялі сканцэнтравана глядзіць уперад ва ўказаным Леніным напрамку.

Па замыслу і характару — гэта адна з самых удалых работ З. І. Азгура. Скульптурная група З. І. Азгура будзе ўстаноўлена ў беларускім павільёне на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы. Апрача гэтай групы, Азгурам выканан таксама скульптурны бюст Владзіміра Ільіча.

Скульптар А. В. Грубэ прысвяціў Леніну адну з вялікіх сваіх прац. Ён выразаў па дрэву групавы барэльеф, які паказвае Леніна і ўзброеных рабочых у дні Кастрычніка. Гэты барэльеф знаходзіцца ў Тэатры юнага гледача.

У Палацы піянераў выстаўлен бюст Леніна, створаны А. М. Бразэрам.

У апошні час над вобразам Леніна працуе малады скульптар С. Аншэлевіч. Яшчэ зусім нядаўна Аншэлевіч быў рабочым-металістам. Даведаўшыся аб здольнасцях Аншэлевіча, рабочыя завода камандыравалі яго вучыцца ў Акадэмію мастацтваў. Зараз Аншэлевіч — скульптар. Яго бюст Леніна, асабліва ў новым варыянце, характарызуецца значным разуменнем формы і сілай характарыстыкі ленінскага вобраза. Праўда, гэта яшчэ толькі пачатак, але ён дае права спадзявацца, што Аншэлевіч справіцца са сваёй задачай, створыць выразны рэалістычны партрэт вялікага правадыра.

Беларускія скульптары працуюць над вобразам Леніна і ў галіне манументальнай скульптуры. Да ліку лепшых работ гэтага жанру трэба аднесці помнік Леніну ў Полацку, пабудаваны па праекту засл. дзеяча мастацтваў А. А. Бембеля. Ленін стаіць на высокім пастаменце, звяртаючыся з заклікам да народа. Справа і злева ад яго размешчаны скульптуры ідучых у бой матроса і чырвонаармейца. У бар'ер трыбуны ўмураван вялікі барэльеф, які паказвае герлічную барацьбу беларускага народа з белапалякамі. Помнік раскрывае вобраз Леніна як правадыра пралетарскай рэвалюцыі і арганізатара перамог савецкага народа ў барацьбе з імперыялістамі. Па праекту Бембеля пабудаван помнік Леніну ў Слуцку.

З іншых помнікаў Леніну назавем помнік у Барысаве, пабудаваны па праекту засл. дзеяча мастацтваў А. В. Грубэ.

Жывапісцамі і скульптарамі Савецкай Беларусі праароблена вялікая работа па стварэнню мастацкага вобраза В. І. Леніна. Зразумела, уся гэта работа з'яўляецца толькі пачаткам паглыбленай работы над мастацкім раскрыццём вобраза вялікага правадыра.

Ленін! Імя яго ў нашых сэрцах, у здзіўляючых справах стаханаўцаў, у подвігах доблесных пагранічнікаў, у новых навуковых вынаходствах савецкіх вучоных, у песнях народа, у творчасці нашых жывапісцаў і скульптараў.

Ленін памёр, але ён неўміручы, як неўміруч вялікі савецкі народ, які пад кіраўніцтвам вялікага Сталіна ідзе па ленінскаму шляху — к комунізму.

А. ДАЛІН.

34 ГАДАВІНА 9 СТУДЗЕНЯ 1905 года

В. І. ЛЕНІН

ПАЧАТАК РЭВОЛЮЦЫІ У РАСІІ

Жнэва, серада 25 (12) студзеня.

Найвялікшыя гістарычныя падзеі адбываюцца ў Расіі. Пролетарыят паўстаў супроць царызма. Пролетарыят быў даведзен да паўстання ўрадам. Цяпер наўрад ці магчымы сумненні ў тым, што ўрад наўмысна даваў параўнальна беспярашкодна развіцца стачачнаму руху і пачацца шырокай дэманстрацыі, жадаючы давесці справу да прымянення ваеннай сілы. І ён давёў да гэтага! Тысячы забітых і параненых — такія вынікі крывавай нядзелі 22 (9) студзеня ў Пецербургу. Войска перамагло бяззбройных рабочых, жанчын і дзяцей. Войска адолела непрыяцеля, расстрэльваючы ляжаўшых на зямлі рабочых. «Мы далі ім добры ўрок!» з невыказным цынізмам гавораць цяпер царскія слугі і іх еўрапейскія лакеі з кансерватыўнай буржуазіі.

Так, урок быў вялікі! Рускі пролетарыят не забудзе гэтага ўрока. Самыя непадрыхтаваныя, самыя адсталыя слаі рабочага класа, якія наіўна верылі ў цара і шчыра жадалі мірна перадаць «самому цару» просьбы змучанага народа, усе яны атрымалі ўрок ад ваеннай сілы, кіруемай царом альбо дзядзькам цара, вялікім князем Уладзімірам.

Рабочы клас атрымаў вялікі ўрок грамадзянскай вайны; рэволюцыйнае выхаванне пролетарыята за адзін дзень шагнула ўперад так, як яно не магло-б шагнуць за месяцы і годы шэрага будзённага, забітага жыцця. Лозунг геройскага пецербургскага пролетарыята: «смерць альбо свабода!» рэхам перакатваецца цяпер па ўсёй Расіі. Падзеі развіваюцца з надзвычайнай шпаркасцю. Усеагульная стачка ў Пецербургу расце. Усё прамысловае, грамадскае і палітычнае жыццё паралізавана. У панядзелак 23 (10) студзеня сутычкі рабочых з войскам становяцца больш зацятымі. Наперакор хлуслівым урадавым паведамленням, кроў ллецца ў многіх і многіх частках сталіцы. Падымаюцца рабочыя Колпіна. Пролетарыят узбройваецца і ўзбройвае народ. Рабочыя захапілі, кажуць, Сестрарэцкі зброевы склад. Рабочыя запасаюцца рэвальверамі, куюць сабе зброю са сваіх інструментаў, здабываюць бомбы для адчаянай барацьбы за свабоду. Усеагульная стачка ахапляе правінцыі. У Маскве 10.000 чалавек ужо кінула работу. На заўтра (чацвер 26 (13) студзеня) назначана ўсеагульная стачка ў Маскве. Успыхнуў мяцеж у Рызе. Маніфесціруюць рабочыя ў Лодзі, рыхтуецца паўстанне Варшавы, адбываюцца дэманстрацыі пролетарыята ў Гельсінгфорсе. У Баку, Одэсе, Кіеве, Харкаве, Коўне і Вільні расце бражэнне рабочых і шырыцца забастоўка. У Севастопалі гараць склады і арсенал марскога ведамства, і войска адмаўляецца страляць у паўстаўшых матросаў. Стачка ў Рэвелі і ў Саратаве. Узброеная сутычка з войскам рабочых і запасных у Радоме.

Рэволюцыя разрастаецца. Урад пачынае ўжо мітусіцца. Ад палітыкі крывавай рэпрэсіі ён спрабуе перайсці да эканамічных уступак і адддзелацца падачкай альбо абяцаннем дзевяцігадзіннага рабочага дня. Але ўрок крывавага дня не можа прайсці дарма. Патрабаванне паўстаўшых пецербургскіх рабочых, — неадкладнае скліканне ўстаноўчага схода на аснове ўсеагульнага, прамога, роўнага і тайнага выбарчага права — павінна стаць патрабаваннем усіх бастуючых рабочых. Неадкладнае звяржэнне ўрада — вось лозунг, якім адказалі на бойню 9 студзеня нават верыўшыя ў цара пецербургскія рабочыя, адказалі вуснамі іх правадыра, свяшчэнніка Георгія Гапона, які сказаў пасля гэтага крывавага дня: «у нас няма больш цара. Рака крыві аддзяляе цара ад народа. Няхай жыве барацьба за свабоду!».

Няхай жыве рэволюцыйны пролетарыят! скажам мы. Усеагульная стачка падымае і мабілізуе ўсё больш шырокія масы рабочага класа і гарадской беднаты. Узбраенне народа становіцца адной з бліжэйшых задач рэволюцыйнага моманту.

Толькі ўзброены народ можа быць сапраўдным аплотам народнай свабоды. І тым хутчэй удасца ўзброіцца пролетарыяту, чым даўжэй пратрымаецца ён на сваёй ваеннай пазіцыі забастоўшчыка-рэволюцыянера, тым хутчэй дрогне войска, тым больш знойдзецца сярод салдат людзей, якія зразумеюць, нарэшце, што яны робяць, якія стануць на бок народа супроць ізвергаў, супроць тырана, супроць забойцаў бяззбройных рабочых, іх жонак і дзяцей. Як-бы ні скончылася цяперашняе паўстанне ў самым Пецербургу, ва ўсякім выпадку яно неўнікнёна і немінуча стане першай ступенню да яшчэ больш шырокага, больш свядомага, больш падрыхтаванага паўстання. Ураду, можа быць, удасца адтэрмінаваць час расплаты, але адтэрміноўка толькі зробіць больш грандыёзным наступны крок рэволюцыйнага націску. Адтэрміноўку толькі выкарыстае соцыял-дэмакратыя для згуртавання радоў арганізаваных байцоў і пашырэння вестак аб пачыне пецербургскіх рабочых. Пролетарыят будзе прымыкаць да барацьбы, пакідаючы фабрыкі і заводы, рыхтуючы сабе ўзбраенні. У асяроддзе гарадской беднаты, у асяроддзе мільёнаў сялянства будуць шырэй і шырэй несціся лозунгі барацьбы за свабоду. Рэволюцыйныя камітэты будуць асноўвацца на кожнай фабрыцы, у кожным раёне горада, у кожным значным сяле. Паўстаўшы народ пачне звяргаць усе і ўсялякія ўрадавыя ўстановы царскага самадзяржаўя, абвяшчаючы неадкладнае скліканне ўстаноўчага схода.

Неадкладнае ўзбраенне рабочых і ўсіх грамадзян наогул, падрыхтоўка і арганізацыя рэволюцыйных сіл для знішчэння ўрадавых улад і ўстаноў — вось тая практычная аснова, на якой могуць і павінны злучыцца для агульнага ўдару ўсе і ўсякія рэволюцыянеры. Пролетарыят заўсёды павінен ісці сваім самастойным шляхам, не аслабляючы сваёй сувязі з соцыял-дэмакратычнай партыяй, памятаючы аб сваіх вялікіх канчатковых мэтах вызвалення ўсяго чалавецтва ад усякай эксплуатацыі. Але гэта самастойнасць соцыял-дэмакратычнай пролетарскай партыі ніколі не прымусіць нас забыць аб важнасці агульнага рэволюцыйнага націску ў момант сапраўднай рэволюцыі. Мы, соцыял-дэмакраты, можам і павінны ісці незалежна ад рэволюцыянераў буржуазнай дэмакратыі, ахоўваючы класавую самастойнасць пролетарыята, але мы павінны ісці рука ў руку ў часе паўстання, пры нанясенні прамых удараў царызму, пры адпоры войску, пры нападзеннях на бастыліі праклятага ворага ўсяго рускага народа.

На пролетарыят усёй Расіі глядзіць цяпер з ліхарадачным нецярпеннем пролетарыят усяго свету. Звяржэнне царызма ў Расіі, геройска пачатае нашым рабочым класам, будзе паваротным пунктам у гісторыі ўсіх краін, аблягчэннем справы ўсіх рабочых усіх нацый, ва ўсіх дзяржавах, ва ўсіх канцах зямнога шара. І няхай кожны соцыял-дэмакрат, няхай кожны свядомы рабочы памятае аб тым, якія велізарнейшыя задачы ўсенароднай барацьбы ляжаць цяпер на яго плячах. Няхай не забывае, што ён прадстаўляе патрэбы і інтарэсы і ўсяго сялянства, усёй масы працоўных і эксплуатыруемых, усяго народа супроць агульнанароднага ворага. Ва ўсіх перад вачыма стаіць цяпер прыклад герояў-пролетарыяў Пецербурга.

Няхай жыве рэволюцыя!

Няхай жыве паўстаўшы пролетарыят!

«Вперед» № 4, 31 (18) студзеня 1905 года. Творы, т. VII, стар. 79—81.



9 студзеня 1905 года ў Пецербурзе. Расстрэл рабочай дэманстрацыі ля Нарвскіх варот. Карціна мастака **М. Авілава.** Рэпрадукцыя фотахронікі. ТАСС.



У студзеньскія дні 1905 года ў Пецербурзе на Нікалаеўскім масту (цяпер мост лейтэнанта Шмідта).
Рысунак мастака М. І. Авілава. Рэпрадукцыя фотахронікі ТАСС.



Ленін у выяўленчым мастацтве БССР. Владзімір Ільіч Ленін. Скульптурны партрэт работы С. Аншэлевіча.



Ленін у выяўленчым мастацтве БССР. Владзімір Ільіч Ленін. Партрэт работы мастака Н. І. Гусева.

МАСТАЦКАЯ СТУДЫЯ Ў МАГІЛЕВЕ

Увосені 1938 года ў Магілеве адкрыта мастацкая студыя для дарослых. Гэта з'явілася значнай падзеяй у культурным жыцці Магілева. У нашай краіне створаны ўсе ўмовы для развіцця дараванняў кожнага чалавека.

У сувязі з гэтым цікава прыгадаць факты мінулага. У дарэволюцыйным Магілеве выяўленчае мастацтва было ў загоне. Вельмі рэдка адкрываліся ў ім мастацкія выстаўкі. У ліку іх можна назваць толькі выстаўку выпадкова праязджаўшага праз Магілеў пейзажыста Луна і пазней выстаўку, арганізаваную мастаком Пэнам і яго вучнямі.

У той час, калі ў Менску і Віцебску ўжо існавалі мастацкія школы мастакоў Кругера і Пэна, у Магілеве мастацкая адукацыя моладзі абмяжоўвалася выкладаннем малявання ў сярэдніх школах, даступных тады, як вядома, не кожнаму.

У 1920 годзе горсовет упершыню робіць спробу адкрыць у Магілеве мастацкую студыю, але праз поўгода памяшканне, адведзенае для студыі, было занята іншай установай і студыя спыніла сваё існаванне, не паспеўшы нічым праявіць сябе.

Студыя была ўзноў адкрыта і працавала да моманту расфарміравання універсітэта ў 1922 годзе.


Падрастаючая моладзь, не задавальваючыся набыццём ведаў па маляванню ў агульнаадукацыйнай школе (сямігодцы), імкнецца папоўніць іх. Такім чынам наспела патрэбнасць у адкрыцці ізостудыі. Запіс жадаючых займацца ў студыі быў праведзен у кастрычніку 1938 года. Было пададзена 43 заявы. У ліку паступаючых былі рабочыя, служачыя, студэнты. Студыю адкрылі.

Студыйцы падзелены на дзве паралельныя групы. Кожная група займаецца два разы ў шасцідзёнку. Заняткі паказалі, што агульны ўзровень мастацкага развіцця паступіўшых дастатковы для таго, каб спадзявацца на паспяховую работу ў далейшым.

Да гэтага часу студыйцы абмяжоўваліся вывучэннем малюнка (гіпс, натурморт і накід з жывой натуры). У бліжэйшы час побач з работай па рысунку ў праграму будуць уключаны і работы па жывапісу (для пачатку — акварэллю).

Студыя праводзіць заняткі, не адрываючы людзей ад вытворчасці. Улічваюцца, паколькі гэта магчыма, індывідуальныя ўмовы кожнага студыйца, пры якіх яму прыходзіцца ўдзяляць час для заняткаў мастацтвам.

Выхоўваючы студыйцаў, мы павінны памятаць, што вучоба іх накіравана не толькі на тое, каб навучыць іх ствараць мастацкія творы, але і навучыць разумець мастацтва, цаніць яго.



«Ленін за работай ля станцыі Разліў». Малюнак алоўкам вучня 6 класа магілеўскай сярэдняй школы, вучня студыі выяўленчага мастацтва Н. Мельнікава.

Трэба разумець таксама, што талент не нараджаецца, а заваёўваецца шляхам упартай работы, якая развівае здольнасці чалавека. Калі хто-небудзь са студыйцаў пажадае, ён зможа зрабіць работу ў мастацтве сваёй асноўнай работай. Для тых-жа, хто не ставіць перад сабою такой мэты, заняткі ў студыі павінны быць культурным разумовым адпачынкам, дадатковай працай, якая дае ўнутранае задавальненне.

У краіне соцыялізма, у краіне вялікай Сталінскай Канстытуцыі кожны можа і павінен развіваць свае прыродныя здольнасці.

Мастак К. Н. ГЕДДА.

Гор. Магілеў.

Выстаўка работ мастакоў БССР у Маскоўскім доме пісьменніка

Да вечароў беларускай культуры ў Маскве, якія пачынаюцца 28 студзеня, Саюз совецкіх мастакоў БССР арганізуе ў Маскоўскім доме пісьменніка выстаўку выяўленчага мастацтва. Адабрана каля 50 твораў жывапісу і графікі, у тым ліку творы старэйшых мастакоў Беларусі В. В. Волкава, Я. М. Кругера, Кудрэвіча, а таксама мастакоў Зайцава, Манасзона, Ахрэмчыка, Каржанеўскага і іншых.

Будзе выстаўлен рад акварэльных работ мастака Лейтмана, адлюстроўваючых прамысловы рост Віцебска.

На вечары беларускай культуры ў Маскву выязджае дэлегацыя мастакоў БССР у складзе В. В. Волкава, засл. дзеяча мастацтваў З. Азгура, Пашкевіча і пейзажыста Кудрэвіча.

УСЕСАЮЗНЫ ПЕРАПІС НАСЕЛЬНІЦТВА

ШЧОТЧЫК

У гэтыя дні ён для ўсіх быў жаданым госцем. І тое, што яго чакалі, ён мог беспамылкова вызначыць па тых усмешках, якімі сустракалі яго жыхары да таго незнаёмых яму кватэр, па таму некалькі ўзнятаму настрою грамадзян даверанага яму ўчастка, якіх яму даручана апытаць і звесткі аб іх унесці ў перапісныя лісты ўсесаюзнага перапісу.

Няма слоў, студэнт Менскай вышэйшай комуністычнай сельскагаспадарчай школы Пётр Фёдаравіч Калмыкоў быў задаволен і горд даручанымі яму абавязкамі.

Нават у такой, на першы погляд, нязначнай дэталі, што ў многіх кватэрах на другі дзень перапісу, 18 студзеня, на адрыўных календарах прадаўжаў красавацца лісток з чырвонай лічбай «17» і надпісам «Сёння пачынаецца ўсесаюзны перапіс», ён не мог не заўважыць, што насельніцтва з такой-жа непадзельнай шчырасцю і любоўю, як і ён, чакала гэтага надавычайнага дня.

І на самой справе, для якога совецкага грамадзяніна не з'яўляецца гонарам у дакумэнт гістарычнай важнасці ўпісаць сваё прозвішча і з гордасцю заявіць аб радасці свайго існавання?

Гэта пачуццё гордасці Пётр Фёдаравіч сустракаў на кожным шляху — у паводзінах людзей, у іх адказах.

— Чытаеце? Пішаце?

— Што за пытанне! Вось ужо тры годы, як скончыў інстытут. Чытаю лекцыі па фізіцы і пішу навуковыя працы.

А ў сям'і Гурвіч, калі галава сям'і — маці Фрума Мееравна — стала адказваць на пытанні, якія датычаць яе сына, вучня IV класа, той неўразуменна пацікнуў плячыма і заявіў:

— Навошта гэта, мама, я і сам магу. — І на пытанне шчотчыка «грамадзянін якой дзяржавы?» горда адказаў:

— Грамадзянін Совецкага Саюза.

У кватэры Фрадкіных Калмыкова, пасля таго, як запоўнены былі перапісныя лісткі, запрасілі выпіць шклянку чаю. І як ні адмаўляўся Пётр Фёдаравіч, як ні спасылаўся на тэрміновасць работы, як ні імкнуўся жартамі пераканаць, што шклянка чаю прадугледжана ў пытанні № 17, а ў перапісным лістку іх усяго 16, — шклянку чаю выпіць усё-ж такі прыйшлося і нават затрымацца, бо муж і жонка Фрадкіны — першы эканаміст, другая ўрач — у досыць красамоўнай гутарцы нарысавалі карціну становішча совецкай інтэлігенцыі. І для шчотчыка Калмыкова гэта гутарка была тым больш цікавай, што праз год, па сканчэнні школы, ён таксама ўвальецца ў рады совецкай інтэлігенцыі.

Розныя дамы, розныя прозвішчы і прафесіі, але ўсюды шчотчык Калмыкоў бачыў перш за ўсё адно — радасць, радасць чалавека, які набыў сваё шчасце ў краіне соцыялізма.

Ну, як, напрыклад, не радавацца той-жа самай Гурвіч, Фруме Мееравне? У маладосці Фрума Мееравна марыла стаць швачкай: швейная машынка — гэта ўсё-ж такі пэўны кавалак хлеба. Аб большым марыць яна не магла. З горыччу ўспамінае Фрума Мееравна аб гэтых далёка адышоўшых днях цяпер, калі яна жыве са шчасліва забяспечанай сям'ёй. Старэйшая дачка Лія працуе бухгалтарам, сын Самуіл — механік, сама Фрума Мееравна — работніца швейнай фабрыкі «Кастрычнік», зарабляе дастаткова для таго, каб яе малодшыя сыны Ілья і Грыгорый адчувалі сябе шчаслівымі.

70-гадовы стары Нікнік, Аляксандр Матвеевіч, з вялікім хваляваннем расказаў шчотчыку Калмыкову аб тым, як ён да рэволюцыі марыў вучыцца і не змог — не дазваляла беднасць, і аб тым, як ён рад цяпер, што яго сын скончыў інстытут.

І шчотчык Калмыкоў добра разумеў жаданне гэтых людзей расказаць аб сабе, — гэта былі апавяданні аб радасці, якую дала ім Совецкая ўлада. І ён адчуў гэта з яшчэ большай сілай, калі ўвечары пасля таго, як працоўны дзень яго быў ужо скончан, прышоў да яго дамоў такі-ж, як ён, шчотчык і, прыветліва ўсміхнуўшыся, сказаў:

— А цяпер з вамі.

У скупых пытаннях перапісу Пятру Фёдаравічу раскрылася яго жыццё.

За плячамі 38 год, за плячамі ўбогае маленства сялянскага хлопчыка, аднаго з 13-ці сваіх братоў і сясцёр, за плячамі смерць 9-ці з іх і смерць маці і бацькі, якія не дажылі да 50 год, — і на ўсім гэтым пячатка безвыходнага гора, беспрасветнай галечы і смутку.

— Адукацыя? — як-бы задумваючыся, гаворыць Пётр Фёдаравіч. — Яго адукацыя пачалася пад Кранштатам, калі па вясенняму ільду, па калена ў вадзе ён разам са сваімі таварышамі ішоў на падаўленне мяцежу, на абарону рэволюцыі. Яна атрымана ім у большэвіцкай партыі, у якой састаіць ён з тых знамянальных дзён.

А цяпер — учарашні калгаснік, старшыня калгаса — ён канчае Вышэйшую комуністычную сельскагаспадарчую школу з тым, каб стаць камандзірам сельскай гаспадаркі.

Так, гэта магла даць толькі Совецкая ўлада. І таму з такім-жа хваляваннем і гонарам, як і сотні іншых грамадзян, якіх апытваў ён сам пры перапісу, ён гаворыць:

— Я грамадзянін Совецкага Саюза!

І паціскае шчотчыку руку. У гэтым поціску ўдзячнасць і пачуццё любві да ўсяго таго, што абняло сабою вялікае і светлае слова — Радзіма.

А. Ш.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

МАРКСІСЦКА-ЛЕНІНСКАЕ ВЫХАВАННЕ ПІСЬМЕННІКАЎ — ПЕРШАЧАРГОВАЯ ЗАДАЧА

У сваёй пастанове ад 14 лістапада 1938 года ЦК ВКП(б) канстатыраваў, што, не гледзячы на асабліва важную ролю інтэлігенцыі ў совецкай дзяржаве, да гэтага часу яшчэ не зжыты пагардлівыя адносіны да нашай інтэлігенцыі. Такія адносіны да совецкай інтэлігенцыі ЦК ВКП(б) кваліфіцыраваў як дзікія, хуліганскія і небяспечныя для совецкай дзяржавы.

«Неабходна зразумець, — гаворыцца ў пастанове ЦК ВКП(б), — што іменна закінутасць палітычнай работы сярод інтэлігенцыі, сярод нашых кадраў, прывяла да таго, што частка нашых кадраў, якая аказалася па-за палітычным уплывам партыі і пазбаўленая ідэйнай загартаванасці, палітычна звіхнулася, заблыталася і стала здабычай іншаземных разведак і іх троцкісцка-бухарынскай і буржуазна-нацыяналістычнай агентуры».

Гэта ўказанне ЦК ВКП(б) бясспрэчна правільна і прама гаворыць аб недахопах партыйна-палітычнай работы сярод пісьменнікаў БССР. Бясспрэчна і тое, што ў Саюзе совецкіх пісьменнікаў Беларусі існавалі «махаеўскія», антыленінскія адносіны ў справе марксісцка-ленінскага выхавання пісьменнікаў, як аднаго з важнейшых атрадаў совецкай інтэлігенцыі.

Досыць сказаць, што да сярэдзіны 1938 года сярод пісьменнікаў зусім не праводзілася марксісцка-ленінская вучоба, не авалодвалі тэорыяй марксізма-ленінізма і члены партыі, чым яўна парушалі статут партыі.

Рэшткі «махаеўскіх», антыленінскіх адносін да пісьменнікаў з боку партыйнай арганізацыі ССПБ адчуваюцца яшчэ і зараз. Вельмі марудна праводзіць партарганізацыя ў жыццё рашэнне ЦК ВКП(б) «Аб пастаноўцы партыйнай прапаганды ў сувязі з выпускам «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)». Члены і кандыдаты партыі ў нашай арганізацыі маюць усё неабходнае, каб даць прыклад іншым партарганізацыям, беспартыйнай інтэлігенцыі, каб даць узор большэвіцкай работы па авалодванню марксізмам-ленінізмам, па вывучэнню гісторыі ВКП(б). Нажаль, гэтага няма.

У партарганізацыі ССПБ састаіць 13 чалавек: 12 членаў партыі і 1 кандыдат. Толькі адзін член партыі малапісьменны, астатнія маюць сярэднюю і вышэйшую адукацыю. Усе згадзіліся вывучыць курс гісторыі ВКП(б) па вышэйшаму, трэцяму звяну. Два месяцы прайшло з дня надрукавання пастановы ЦК ВКП(б) аб партпрапагандзе, а перабудова партпрапаганды, справа вывучэння курса гісторыі партыі не рушыць наперад.

З 12 членаў партыі яшчэ ніхто не прачытаў усяго падручніка. Толькі некаторыя таварышы (Кунькоў, Варашылаў) прысутнічалі ў Доме партактыва на двух лекцыях і кансультацыях. Да глыбокага вывучэння першага раздзелу падручніка прыступіла толькі 5 чалавек, з іх чатыры таварышы адначасова з вывучэннем тэмы па падручніку вывучаюць адпаведныя творы Маркса, Энгельса, Леніна і Сталіна.

З 29 беспартыйных пісьменнікаў і работнікаў апарата ССПБ толькі 16 прыступілі да вывучэння гісторыі партыі, з іх адзін тав. Крапіва ў дадатак да першага раздзелу падручніка прапрацаваў твор Леніна «Што такое «прыяцелі народа». Добрасумленна працуе і Якуб Колас. Ён глыбока вывучае чацверты раздзел, канспектыруе прачытанае. Прачытаў увесь падручнік і З. Бядуля і зараз працуе над чацвертым раздзелам. Нажаль, лекцый і кансультацый, якія праводзяцца ў Доме партактыва, з пісьменнікаў да гэтага часу ніхто не наведваў.

Такое становішча з вывучэннем курса гісторыі партыі тлумачыцца тым, што партарганізацыя ССПБ да гэтага часу не змагла як след растлумачыць пісьменнікам рашэнне ЦК ВКП(б) «Аб пастаноўцы партыйнай прапаганды ў сувязі з выпускам «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)».

Партарганізацыя ССПБ, групком павінны з гэтых фактаў зрабіць належныя вывады, правесці рад мерапрыемстваў, забяспечваючых выкананне пастановы ЦК ВКП(б) аб партпрапагандзе. Трэба кожнаму комуністу, комсамольцу, беспартыйнаму пісьменніку і служачаму ўсвядоміць, што «задача марксісцка-ленінскага выхавання совецкай інтэлігенцыі з'яўляецца адной з самых першачарговых і важнейшых задач партыі большэвікоў».

Г. БУТЭЛІН.

„Наша творчасць“

(Літаратурны журнал Мэнскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага)

Перш чым гаварыць аб змесце гэтага журнала, хочацца адзначыць яго цікавае афармленне. Шчыра кажучы, нават выдавецтву не дрэнна было-б павучыцца ў рэдкалегіі журнала, як трэба афармляць кнігі. Няма тут ні «спецыфічных» выдавецкіх «кругоў» і «авалаў» з незразумелымі малюнкамі ўнутры іх, ні загалоўкаў, якія пужаюць чытачоў сваім выглядам. Усё зроблена прыгожа, з любоўю, са стараннасцю.

Само выданне інстытутам гэтага журнала, прысвечанага 20-годдзю ленінскага комсамола — з'ява вельмі радасная. Яна гаворыць аб тым, як прагне совецкая моладзь апець у сваіх, няхай яшчэ не зусім кваліфіцыраваных, але шчырых, ад душы напісаных вершах і песнях веліч Сталінскай эпохі, урачыстасць совецкага народа і яго гатоўнасць да абароны радзімы.

У журнале ўдзельнічае 12 пачынаючых аўтароў. Журнал складаецца з трох раздзелаў: паэзіі, прозы і крытыкі.

Першая старонка журнала адкрываецца вершам паэтэсы Сары Каган «Материнский привет», напісаным ёю для журнала на рускай мове. Колькі шчырасці і пачуцця ў гэтым вершы! З якой цеплынёй звяртаецца паэтэса да комсамольцаў — шчаслівага совецкага пакалення, перад якім шырока расчынены дзверы ў шчаслівую будучыню.

Недахопам верша з'яўляецца тэхнічная недапрацаванасць: збіўчывы рытм, часам слабая рыфма.

Лепшымі ў журнале з'яўляюцца вершы маладых паэтаў Б. Сасноўскага, М. Жука і М. Аўрамчыка. Можна з упэўненасцю сказаць, што паэзіяй гэтыя таварышы займаюцца сур'ёзна, працуюць крапатліва, настойліва. У іх вершах адчуваецца веданне элементарных законаў паэтыкі. Чоткая, гучная рыфма, плаўная, стройная рытміка, трапныя метафары, параўнанні, эпітэты; сустракаюцца і зусім свежыя, яркія вобразы. А што галоўнае, дык гэта тое, што вершы гэтыя — не проста набор слоў, а выращэнне пэўнага сюжэта, паказ перажыванняў, пачуццяў; вершы маюць змест.

Я ў мірны час кладу у мур
Рукамі дужымі цагліны,
Каб рос будынак, што ў час бур
Мы закладалі на руінах, —

піша М. Жук у вершы «Адданасць радзіме». Гэта — адчуванне ўласнай сілы, выражэнне прагнасці совецкага маладога чалавека да ўдзелу ў будаўніцтве соцыялістычнай радзімы.

Гэтае-ж адчуванне сілы і гатоўнасці будаваць і абараняць радзіму выказвае і Б. Сасноўскі:

Кожны дужы і высокі,
Кожны славіцца між нас.

Ці вось верш М. Аўрамчыка:

...Колькі ёсць у нас лепшых сяброў,
Колькі з іх ёсць бясстрашных герояў
І адданых радзіме сыноў.
На вадзе, угары над зямлёю
Усе дарогі адкрыты для нас.

Вялікай падзякай гучаць гэтыя радкі таму, хто адкрыў моладзі шырокія дарогі, — вялікаму Сталіну, маці-радзіме, якая дала шчасце і сілу людзям.

Гэта самае можна-б было сказаць і аб вершах іншых пачынаючых паэтаў, якія ўвайшлі ў журнал, але, нажаль, гэтыя вершы паўтараюць, перапяваюць тое, што сказана ўжо іншымі паэтамі — як у адносінах сюжэта, так і ў адносінах паэтычнага прыёму.

З прозы найбольшую цікавасць уяўляе апавяданне Н. Гапансьіча «Крупнік з грыбамі». Гэта, уласна, не апавяданне, а хутчэй старонкі з цікавага дзённіка аб апошніх часах панавання «нядолі людской» на Беларусі. Аўтар цікава разгортвае звычайныя маленькія падзеі ў сялянскай сям'і. Стары, спрацаваны дзед, выплакаўшая вочы маці, галодныя дзеці. Якое шчасце — у іх сёння крупнік з грыбамі! Але дзед знянацку перакульвае ў печы гаршчок з крупнікам, крупнік прышлося зграбаць у міску рукамі. Дзеці сёрбаюць яго, вугалле трашчыць на зубах, але — голад, голад! — няхай трашчыць...

Іншыя празаічныя творы слабыя, і ў іх адчуваецца некаторы ўплыў кніжнай рамантыкі.

Кароткія артыкулы-водгукі — Н. Ролава аб кнізе Энджэло Херндона «Я буду жить» і Т. Фарбера «Кніга аб герачным комсамоле Германіі» («Твой неизвестный брат» В. Брэдэля) — сведчаць аб крытычных здольнасцях аўтароў. Аўтары гэтых артыкулаў выступаюць як удумлівыя чытачы, якім дорага кожнае слова прачытанай імі кнігі. Няхай яны не зусім яшчэ вопытныя ў крытыцы, але тое, што іх невялічкія артыкулы маюць даволі трапныя вывады і азначэнні, сведчыць, што пры настойлівай працы над творамі яны могуць зрабіцца добрымі крытыкамі.

Выпуск журнала — пачынанне добрае і карыснае. Пажадаем таварышам з інстытута плённай работы, каб чарговы нумар іх журнала быў яшчэ больш цікавым, каб у ім былі яшчэ лепшыя творы.

К. ЦІТОЎ.



У кіностудыі Мосфільм закончан вытворчасцю мастацкі гісторыка-рэвалюцыйны фільм «Ленін», які з'яўляецца працягам фільма «Ленін у Кастрычніку». Рэжысёр фільма — М. Ромм, галоўны аператар — Б. Валчок. Ролю В. І. Леніна выконвае нар. арт. СССР Б. В. Шчукін.

НА ЗДЫМКУ: У габінеце Леніна. Сустрэча Леніна — нар. арт. СССР ордэнаносец Б. В. Шчукін—з Горкім—засл. арт. РСФСР ордэнаносец М. К. Чэркасаў.
Фотахроніка ТАСС.

ШЭФСТВА НАД САМАДЗЕЙНАСЦЮ— НАШ ПРАМЫ АБАВЯЗАК

Прачытаўшы ў газеце «Літаратура і мастацтва» № 3 пісьмо старшыні фабкома Менскай швейнай фабрыкі імя 8 сакавіка, у якім выказваецца пажаданне атрымаць кансультацыю работнікаў мастацтваў для харавога гуртка мастацкай самадзейнасці, выказваю сваю згоду дапамагчы самадзейнаму калектыву фабрыкі ўзняць якасць яго выканання народных і рэвалюцыйных песень на больш высокую ступень.

Лічу, што **шэфства работнікаў мастацтва над калектывамі мастацкай самадзейнасці — наш прамы абавязак.**

Думаю, што і іншыя работнікі мастацтваў, напрыклад, т.т. Багатыроў, Аладаў, Ефімаў, Равенскі, таксама не адмовяцца прыняць шэфства над калектывамі мастацкай самадзейнасці.

Кампазітар САКАЛОЎСКІ.

МАСТАЦКАЕ АФАРМЛЕННЕ ПАВІЛЬЁНА БССР НА ЎСЕСАЮЗНАЙ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ВЫСТАЎЦЫ

4 студзеня Упраўленне па афармленню Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі ўхваліла праект унутранага мастацкага афармлення павільёна БССР, прадстаўлены мастакамі Алгуф'евым і Станкевічам.

Белізокамбінат пры Упраўленні па справах мастацтваў выконвае для павільёна БССР рад работ. Мастакі В. В. Волкаў, Зайцаў, Ахрэмчык і Фогт працуюць над фрызамі на тэмы: «Тав. Кагановіч — арганізатар большэвікоў Палесся», «Тав. Орджанікідзе — арганізатар разгрому белапольскіх акупантаў у 1920 годзе пад Барысавам», «Тав. Фрунзе — баявы кіраўнік першых органаў рэвалюцыйнай улады ў Менску ў 1917 годзе», «Нарком абароны СССР — першы маршал Савецкага Саюза тав. Варашылаў — сярод калгаснікаў у часе манеўраў войск Беларускай ваеннай акругі». Размер фрызаў — 14 метраў даўжыні і 1,63 метра вышыні.

Мастак Е. Н. Тарас падрыхтаваў да друку мастацкі плакат на тэму «За права ўдзелу ва Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы». Плакат будзе надрукаван у колькасці 10 тысяч экземпляраў.

Засл. дзеяч мастацтваў скульптар Грубэ выканаў для афармлення фасада павільёна БССР арнаментальнае панно плошчаю больш 50 кв. метраў.

Скульптары Орлоў і Глебаў выконваюць двухфігурную скульптурную групу вышынёй у 3 метры на тэму: «Абарона соцыялістычнай бацькаўшчыны ёсць свяшчэнны абавязак кожнага грамадзяніна СССР». Група ўяўляе сабою байца пагранічных войск НКВД і жанчыну-калгасніцу.

Мантаж усіх фрызаў і скульптурных работ выконваецца сіламі Белізокамбіната на месцы.

Засл. дзеяч мастацтваў скульптар Азгур па заказу выстаўкома выконвае для цэнтральнай залы павільёна скульптурную групу: «Ленін і Сталін — творцы і арганізатары беларускай дзяржаўнасці».

Апрача таго, група мастакоў распрацоўвае зараз для прадстаўлення галоўвыстаўкому дэтальнае афармленне двух калгасаў-экспанентаў.

АЛІМПІЯДА РАБОЧЫХ КАНДЗІЦЕРСКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Гэтымі днямі ў клубе імя Сталіна закончылася першая алімпіяда мастацкай самадзейнасці рабочых кандзіцерскай прамысловасці БССР. У алімпіядзе прынялі ўдзел 185 чалавек з чатырох буйнейшых прадпрыемстваў нашай кандзіцерскай прамысловасці: менскай фабрыкі «Комунарка», гомельскага камбіната «Спартак», нараўлянскай фабрыкі «Чырвоны мазыранін» і барысаўскай макароннай фабрыкі імя Леніна. Побач са старымі калектывамі самадзейнасці (харавыя гурткі «Комунаркі» і «Спартака») у алімпіядзе ўдзельнічалі і зусім маладыя калектывы: танцавальны гурток фабрыкі імя Леніна і харавы гурток фабрыкі «Чырвоны мазыранін», арганізаваныя ўсяго некалькі месяцаў назад.

Выяўлены новыя здольныя выканаўцы: тав. Вайнштэйн са «Спартака», які іграе адначасова на гітары і губным гармоніку, тав. Мішэлевіч з таго-ж камбіната, які іграе на свірэлі, тав. Славікоўскі з фабрыкі «Комунарка» — жанглёр, тав. Зубава з той-жа фабрыкі — мастацкае чытанне, тав. Кобец з «Чырвонага мазыраніна», якая вельмі ўдала выконвае «гапак».

Лепшую ацэнку журы атрымалі харавы і балетны калектывы і дзіцячая танцавальная група «Комунаркі», харавы і балетны гурткі «Спартака», хор нараўлянскай фабрыкі пад кіраваннем рабочага тав. Ярохімава і танцавальны гурток фабрыкі імя Леніна. Усе гэтыя калектывы прэміраваны.

З салістаў прэміраваны тав. Індых і яго дачка, тт. Зубава і Славікоўскі («Комунарка»), тт. Вайнштэйн, Грабянюк, дачка работніцы тав. Муляр («Спартак») і работніца тав. Кобец («Чырвоны мазыранін»).

УШАНАВАННЕ ПАМЯЦІ ВЯЛІКАГА ЗОДЧАГА М. Ф. КАЗАКОВА

У менскім Доме тэхнікі 17 студзеня адбыўся ўрачысты сход, прысвечаны 200-годдзю з дня нараджэння вялікага рускага зодчага Мацвея Фёдаравіча Казакова. На сходзе прысутнічалі архітэктары, скульптары, мастакі, прадстаўнікі грамадскасці. Даклад аб творчасці архітэктара М. Ф. Казакова, аднаго з выдатных будаўнікоў Масквы, зрабіў доктар архітэктуры праф. С. В. Бяссонаў.

У Доме тэхнікі ў сувязі з ушанаваннем М. Ф. Казакова адкрыта прыбыўшая з Масквы перасовачная выстаўка, прысвечаная творчасці юбіляра.

АНСАМБЛЬ ЧЫГУНАЧНІКАЎ

Ансамбль песні і пляскі Полацкага чыгуначнага вузла карыстаецца вялікай папулярнасцю сярод слухачоў. Ансамбль налічвае 40 чалавек. Выступленні яго праходзяць з вялікім поспехам. Кіруюць ансамблем Гур'еў і Прохараў.

Зараз ансамбль рыхтуе літмантажы на тэму аб чыгунцы і аб жыцці пагранічнага калгаса.

Г. М.

Полацк.

ЧАРГОВАЯ РАБОТА ПОЛАЦКАГА КАЛГАСНАГА ТЭАТРА

Полацкі калгасны тэатр працуе зараз над п'есай Арбузава «Таня». Галоўныя ролі выконваюць акторы Сувeрава, Лабакоў, Сярогін, Мальцава. П'есу ставіць рэжысёр А. Ліпероўскі.

„КОСЦЯ-ЧЭКІСТ"—М. КАЛАЧЫНСКАГА

Малады паэт-комсамолец Міхась Калачынскі напісаў для дзяцей школьнага ўзросту паэму «Косця-чэкіст».

Тэмай гэтай паэмы з'яўляецца высокая класавая пільнасць совецкіх дзяцей, юных патрыётаў нашай радзімы, іх удзел у барацьбе з ворагамі народа — шпіёнамі і дыверсантамі.

Некаторыя з беларускіх крытыкаў, якія першымі хочуць сказаць «Э!» адносна тэмы барацьбы са шпіёнамі і дыверсантамі ў мастацкай літаратуры, пачынаюць выказваць даволі пошлыя мыслішкі аб тым, што, маўляў, пісьменнікі гоняцца «за модай», задавальваюць «попыт рынку» і інш., калі так ці інакш адлюстроўваюць гэту тэму ў сваіх творах.

А тэма гэта будзе яшчэ доўгі час хваляваць совецкіх пісьменнікаў, і чытач са здавальненнем сустрэне яшчэ рад мастацкіх твораў у беларускай літаратуры аб барацьбе з ворагамі народа, з каварнымі прыёмамі фашысцкіх разведак, якія стараюцца засылаць у Совецкі Саюз свае банды.

Тэма гэта надзвычай актуальная, і гаварыць аб ёй у крытыцы трэба ў такім напрамку, каб папярэдзіць пісьменнікаў ад сюжэтнага штампу, ад надуманасці ў яе адлюстраванні. Рэалістычна раскрыць у мастацкіх вобразах каварныя метады фашысцкіх разведак — удзячная тэма для кожнага совецкага пісьменніка.

Міхась Калачынскі ў сваёй паэме для дзяцей паказвае, як совецкія дзеці, жыццёрадасныя, дапытлівыя школьнікі, добра ведаючы з кніжак і газет барацьбу з класавымі ворагамі, страсна ненавідзяць іх і сваім удзелам у гэтай барацьбе дапамагаюць слаўным чэкістам выкрываць шпіёнаў і дыверсантаў.

Асноўны герой паэмы — трынаццацігадовы Косця, сын вартавога на чыгунцы, разумны хлапчук і летуценнік.

— Ён чуў пра Чкалава палёт
Праз сцюжы, грозныя бураны,
І чуў, як смела за народ
Памёр герой — Васіль Баранаў.

Косця — вясёлы, жыццёрадасны піонер, любіць сваю станцыю Пагосціж, любіць лес, сваіх таварышоў-піонераў, любіць Чырвоную Армію, у якой знаходзіцца яго брат, што ахоўвае рубяжы нашай краіны на Далёкім Усходзе. Косця разам з таварышамі спявае мужную песню пра героя Баранава, загінуўшага на ахове далёка-усходняй граніцы.

Косця марыць зрабіць гераічны ўчынак у барацьбе са шпіёнамі, дыверсантамі, але ён уяўляе іх наіўна, па-дзіцячаму.

— Шпіёў такі: сярдзіты, строгі,
Кругом наганы, морда лычам...

Сюжэтны вузел паэмы завязваецца ў пачатку твора, калі Косця на станцыі Пагосціж сустракае незнаёмага чалавека. Косця ўвесь час сочыць за паводзінамі незнаёмца і, нарэшце, перашкаджае гэтаму ворагу зрабіць дыверсійны акт на чыгунцы, выратоўваючы такім чынам ад крушэння цягнік. На гэтым канфлікце пабудаван сюжэт паэмы. Косця сапраўды становіцца героем. Яго мары ператварыліся ў сапраўднасць.

Сюжэт паэмы тав. Калачынскага разгортваецца паволі, асобныя раздзелы паэмы ўвязваюцца ў агульнай сюжэтнай лініі штучна, яны нават могуць быць апушчаны ў творы, і цэласнасць паэмы нікольк не страціцца. Напрыклад, у паэме можна апусціць раздзел «Хто-ж на дрэве?» і твор нікольк не парушыцца.

Кожны раздзел паэмы з'яўляецца асобным лірычным вершам, а таму ўсе раздзелы ў храналагічнай паслядоўнасці звязаны паміж сабою механічна. Гэта сведчыць аб недастатковым уменні аўтара пісаць сюжэтныя паэтычныя творы.

Тэхніка вершаў маладога паэта ў некаторых месцах паэмы слабая, не гледзячы на тое, што Калачынскі напісаў рад добрых мастацкіх вершаў.

Напрыклад, страфа:

— Цягнік ідзе на павароце,
Чуваць жалезных колаў грук;
Спакой трывожыць у прыродзе,
Грукоча сцішана тук-тук, —

слабыя вершаваныя радкі. Выраз «Спакой трывожыць у прыродзе»—бездапаможны слоўны выраз не толькі паэтычнай мовы, а нават звычайнай разгаворнай.

Недахопы ў кампазіцыі паэмы, шарахаватасць мовы, безумоўна, зніжаюць пазнавальную якасць усяго твора. Але гэта не значыць, што паэма «Косця-чэкіст» не мае права на існаванне. Нашы школьнікі атрымалі яшчэ адзін мастацкі твор, які прачытаюць не без цікавасці, паколькі мары і справы Косці ёсць адначасова і іх мары і справы.

М. КАРПАЧОЎ.

РАБОТЫ МАСТАКОЎ-САМАВУЧАК ПОЛАЦКА

У нашай краіне стала звычайным наладжваць выстаўкі мастакоў-самавучак і многія экспанаты гэтых выставак бываюць цікавей за работы мастакоў-прафесіяналаў.


Над чым-жа працуюць зараз мастакі-самавучкі Полацка? Дзімітрый Хадатовіч працуе над карцінай «Асада Полацка Іванам Грозным — 1573 год». Мастак мяркуе напісаць карціны: «Польска-латвійскія інтэрвенты ў Полацку ў 1918 годзе» і «Вызваленне Полацка ад белапалякаў у 1920 годзе».

Анатолій Хадатовіч піша партрэт таварыша Сталіна і працуе над карцінай «Бой у раёне возера Хасан».

Скульптар Васілій Петлеў працуе над барэльефам «Ленін і Сталін». З закончаных работ В. Петлева вылучаецца барэльеф «Кіраў».

Мастак Браніслаў Шадэўскі працуе над беларускімі пейзажамі.

Г. М.



Сцэна з балета «Бахчысарайскі фантан».

СЦЭНАРЫЙ ФІЛЬМА „БАГДАН ХМЯЛЬНІЦКІ"

Вядомы украінскі драматург, дэпутат Вярхоўных Советаў СССР і УССР тав. А. Е. Карнейчук напісаў сцэнарый кінокарціны «Багдан Хмяльніцкі». Сцэнарый прынят да пастаноўкі Кіеўскай кіностудыяй. Сцэнарый паказвае, як украінскі народ у мінулым змагаўся супроць сваіх прыгнятальнікаў.

Над пастаноўкай першай серыі фільма «Багдан Хмяльніцкі» (аўтар мяркуе напісаць другую серыю) Кіеўская кіностудыя будзе працаваць з такім разлікам, каб фільм паявіўся на экране ў першым квартале 1940 года

І. Д.

Кіеў (наш кар.).

„БАХЧЫСАРАЙСКІ ФАНТАН"

(Да пастаноўкі Тэатрам оперы і балета БССР)

У адкрываемым у лютым гэтага года Вялікім тэатры оперы і балета сярод іншых новых работ глядач убачыць і «Бахчысарайскі фантан».

Гэта харэаграфічная п'еса дасканала прапрацавана мною разам з таленавітым мастаком Н. Каровіным і дырыжорам спектакля Н. С. Балазоўскім.

У цэнтральных ролях выступаюць засл. арт. рэсп. З. А. Васільева (Марыя), засл. арт. рэсп. А. В. Нікалаева (Зарэма), С. Дрэчын (Гірэй), Муллер (Вацлаў).

Працуючы над пастаноўкай «Бахчысарайскага фантана», беларускі балет спаборнічае з братнімі рэспублікамі. З прынцыпа спаборніцтва вынікаюць: страснасць у рабоце, самакрытычнасць, уважлівасць, глыбокае вывучэнне і дасканалая прапрацоўка матэрыялу.

Лібрэта балета «Бахчысарайскі фантан», напісанае Волкавым, з'яўляецца фактычна пераказам пушкінскай паэмы і яго можна было-б прызнаць упаўне ўдалым, калі-б у яго не быў штучна ўведзен персанаж Вацлаў — каханы Марыі. Штучна таму, што гэтага персанажа няма ў паэме Пушкіна. Пушкінскі-ж «Бахчысарайскі фантан»—твор настолькі поўнакаштоўны і шматвобразны, што ўсякі дадатковы штрых безумоўна скажае яго.

У сваім лібрэта, якое я склаў перад пачаткам работы ў Белдзяржтэатры з мэтай пазбегнуць якіх-бы то ні было ўвольных элементаў,—гэты персанаж адсутнічаў. Кампазітар-жа катэгарычна засупярэчыў супроць змен як у музычных характарыстыках, так і ў лібрэта. Тады я паспрабаваў усю музычную частку любоўнага парадку, прысвечаную Вацлаву, разбіць на рад дробных эпізодаў такога-ж характару, г. зн. паспрабаваў перарабіць Вацлава ў той «натоўп вяльмож і багачоў», якія шукалі Марыінай рукі і аб якіх сказана ў паэме. Але і гэта аказалася немагчымым, таму што ў волкаўскім і асаф'еўскім «Бахчысарайскім фантане» любоў Марыі да Вацлава праходзіць чырвонай істужкай праз усю п'есу, не гледзячы на тое, што Вацлаў паказан у адным толькі першым акце.

У сілу гэтых абставін мне прышлося прызнаць і дараваць Волкаву і Асаф'еву штучна ўведзенага ў пушкінскую паэму Вацлава.

Для большай лагічнасці і сілы развіцця дзеі вельмі асцярожна і ўважліва перамантыраваны мною разам з дырыжорам тэатра тав. Н. С. Балазоўскім музычныя нумары, што таксама не скажае цэласнасці асаф'еўскага «Бахчысарайскага фантана». Акрамя таго, «Пралог» і «Эпілог» яго захаваны ў поўнай недатыкальнасці. Што тычыцца харэаграфічнага тлумачэння вобразаў Марыі і другіх галоўных персанажаў «Бахчысарайскага фантана», то работа мая пасля дасканалага разбору пушкінскага тэкста звялася да наступнага: для таго, каб ярчэй падкрэсліць лірычнасць, чыстату і ўсе тыя якасці, якімі Пушкін адзначыў Марыю, я вырашыў адлюстраваць яе сродкамі класічнага танца з усёй уласцівай яму ўтончанасцю, хвалістасцю ліній, паветранасцю і г. д., насыціўшы, вядома, гэту танцавальную форму польскім акцэнтам.

Я імкнуся паказаць Марыю як «цяплічную кветку», абкружаную натоўпам нянек і мамак, але ўсе гэтыя памылкі выхавання апраўдаць у Марыі, зрабіць яе станоўчым тыпам, таксама як гэта зроблена ў аўтара паэмы.

Зарэма па характару свайму з'яўляецца поўнай супроцьлегласцю Марыі. Зарэма, у супроцьлегласць Марыі, жыве сучасным, аддаўшы сябе добраахвотна ў рабства пачуццю страснай зямной любві.

Танцы і рухі, у якіх заключана характарыстыка Зарэмы, мною будуюцца выключна на танцавальным фальклоры нашага поўдня і ўсходу, без указання дасканала месца, таму што, мяркуючы па словах самой Зарэмы: «я близ Кавказа рождена»,—цяжка вызначыць, адкуль яна.

Пушкінскі Гірэй — не дзікі, бесшабашны ваяка, які не ведае ні сваіх, ні чужых пакут і слёз, і ні самадур, абжора і крывасмок, якімі звычайна былі ўсходнія царкі і як акрэслівалі яго ў розных апісаннях. Гэта ўладарнік, стратэг і палітык, страсны любоўнік і паэт з лірычнай душой.

Што датычыць выдуманага лібрэтыстамі Вацлава, то я імкнуся прадставіць яго маладым, удалым палякам, настолькі чароўным і закаханым у Марыю, што яна сама вылучыла яго з натоўпу прыгажуноў і абажальнікаў.

Я спыніўся толькі на чатырох цэнтральных героях п'есы для таго, каб указаць на прынцып сваёй работы. Што-ж датычыць астатніх цэнтральных і другарадных персанажаў, то я лічу лішнім у даны момант спыняцца на іх, бо работа над раскрыццём іх вобразаў прыдзе ў часе самой пастаноўкі.

Мастаку, артыстам, усім удзельнікам работы над пастаноўкай «Бахчысарайскі фантан» неабходна дасканала вывучыць паэму, удумацца ў кожны радок, таму што кожны з іх глыбока змястоўны, у кожным з іх няма ні аднаго лішняга слова.

Рэжысёр К. ГАЛЕЙЗОЎСКІ.

НОВЫЯ КНІГІ


У апошнім квартале 1938 года Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі выпусціла рад кніг беларускіх пісьменнікаў і класікаў рускай і сусветнай літаратуры.

Для дзяцей школьнага ўзросту выданы: аповесць «Міколка-паравоз» М. Лынькова і зборнік яго-ж апавяданняў для школьнага і пазашкольнага чытання; кніга казак і вершаў Я. Коласа, у якую ўвайшлі: «Рак-вусач», «Міхасёвы прыгоды» і інш.; зборнік апавяданняў Я. Маўра, «Курылка» — Цэлеша, «Косця-чэкіст»—М. Калачынскага, «Дружба» — зборнік апавяданняў маладога празаіка П. Левановіча і інш.

Кніжная паліца ўзбагацілася таксама творамі К. Крапівы — «Выбраныя сатыры», Э. Самуйлёнка — раман «Будучыня» (аб барацьбе грузінскага народа са сваімі ворагамі), А. Куляшова — «Мы жывём на граніцы», зборнік вершаў аб бясстрашнасці, адвазе і мужнасці чэкістаў, аб адданасці радзіме і поўнакроўным жыцці калгаснікаў, З. Агняцвет — зборнік вершаў.

На рускай мове Белдзяржвыдавецтвам выданы: «Капитанская дочка» А. С. Пушкина, «Война и мир» Л. Н. Талстога, «Посмертные записки Пиквикского клуба» (том 1) Ч. Дзікенса «Крестьяне» і «Нищета и блеск куртизанок» О. Бальзака.

У перакладзе на беларускую мову вышаў з друку зборнік літаратурна-крытычных артыкулаў Н. А. Дабралюбава. У зборнік увайшлі творы: «Што такое абломаўшчына?», «Цёмнае царства», «Калі-ж прыдзе сапраўдны дзень?», «Прамень святла ў цёмным царстве» і «Загнаныя людзі».



НА ЗДЫМКУ: Дом музея В. І. Леніна у г. Казані. У гэтым доме па май 1899 года жыла сям'я Ульянавых. Фотахроніка ТАСС.

Гастролі сімфанічнага аркестра Дзяржаўнай філармоніі БССР

24 студзеня сімфанічны аркестр Дзяржаўнай філармоніі БССР выязджае на гастролі ў Бабруйск, Гомель, Віцебск і Магілеў. У праграме канцэртаў — 5-я сімфонія Шастаковіча, 4-я сімфонія Чайкоўскага, «Скупы рыцар» Цікоцкага і рад твораў Гліэра, Іпалітава-Іванова, Дунаеўскага, Туранкова, Шчэглова і інш.

Разам з аркестрам выязджаюць засл. арт. рэсп. Л. Ф. Аляксеева, дацэнт Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі Амітон, саліст Белрадыёкамітэта Вастокаў.

З гастрольнай паездкі па БССР аркестр вернецца 7 лютага.

Арганізацыя абласных дамоў народнай творчасці

Пастановай Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР у пяці абласных цэнтрах БССР ствараюцца ў 1939 годзе дамы народнай творчасці. Кожны Дом народнай творчасці будзе ўкамплектаван метадыстамі па драматычнаму, музычнаму, харавому, танцавальнаму і выяўленчаму відах народнай творчасці. У абавязкі абласных дамоў народнай творчасці ўваходзіць — арганізацыйна-метадычная дапамога самадзейным калектывам і курсавыя мерапрыемствы па падрыхтоўцы кіраўнікоў гурткоў мастацкай самадзейнасці.

БЯЗДУШНЫЯ АДНОСІНЫ ДА МАЛАДЫХ КАДРАЎ

У канцы снежня 1938 года адбыўся другі выпуск трохмесячных курсаў кіраўнікоў гурткоў мастацкай самадзейнасці, якія працавалі пры Доме народнай творчасці БССР. Курсы скончыла 106 чалавек, з іх больш паловы (63 чалавекі) — на «выдатна» і «добра». Сярод скончыўшых курсы — 51 малады калгаснік, 48 маладых рабочых. Гэта найбольш актыўныя ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці, якія былі камандыраваны на курсы комсамольскімі, совецкімі і профсаюзнымі арганізацыямі.

Здавалася-б, раённыя арганізацыі, атрымаўшы праз тры месяцы падрыхтаваных кіраўнікоў гурткоў мастацкай самадзейнасці, павінны былі гэтаму толькі радавацца. Аднак, у некаторых раёнах аднесліся да прыезду выпускнікоў вельмі бяздушна.

Паводле патрабаванняў абласных палітінспектароў, курсант-выдатнік, комсамолец Круглік быў накіраван Наркамасветы на пасаду загадчыка увараўцкім раённым домам соцкультуры, а другі курсант — Клішчэнка — на пасаду загадчыка кіраўскім раённым домам соцкультуры. Але калі тт. Круглік і Клішчэнка прыехалі на месца, раённыя арганізацыі не дапусцілі іх да работы, матывіруючы гэта тым, што няма свабодных вакансій.

Курсантка танцавальнага аддзялення тав. Кліндзюк была паслана ў распараджэнне пухавіцкага раёна. Аднак, калі пухавіцкае «начальства» шляхам допыту выявіла, што тав. Кліндзюк не ведае «ўсходніх танцаў», яно ў рабоце ёй адмовіла.

Курсант тав. Іваноў быў накіраван Белкаапрамсоветам ў распараджэнне барысаўскага клуба прамкааперацыі. Але на працягу двух тыдняў Іванова ніяк не могуць забяспечыць гуртком, інструментамі і кватэрай.

Курсант тав. Ракіцкі паслан мазырскім раёна ў калгас, дзе няма ні гуртка, ні музыкальных інструментаў для арганізацыі гуртка.

Выдатнік-выпускнік, комсамолец тав. Эпштэйн накіраван на Бабруйскі лесакамбінат, дзе ён і раней працаваў, але да гэтага часу да кіраўніцтва самадзейным гуртком не дапушчан.

І ўсё гэта мае месца, не гледзячы на тое, што гурткі мастацкай самадзейнасці ў калгасах і на прадпрыемствах адчуваюць вялікую патрэбу ў падрыхтаваных кіраўніках.

Партыйныя і профсаюзныя арганізацыі павінны пакласці канец бюракратычным і бяздушным адносінам «рэйвых чыноўнікаў» да маладых кадраў кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці. Совецкая дзяржава траціць велізарныя сродкі на падрыхтоўку кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці. Трэба даць маладым кадрам поўную магчымасць апраўдаць дзяржаўныя выдаткі і прынесці мастацкай самадзейнасці максімальную карысць.

М. БЕЙЛІНАЎ.

У РУСКАЙ СЕКЦЫІ ССП БССР

Амаль на працягу года руская секцыя ССП БССР не збіралася ні аднаго разу. Прычынай гэтага было тое, што пісьменнік тав. Шапавалаў, выдзелены праўленнем ССП БССР для кіравання секцыяй, ніякай работы не вёў. Творы рускіх пісьменнікаў і паэтаў не абмяркоўваліся, а калі друкаваліся, дык без ведама секцыі, стыхійна. Праўленне Саюза совецкіх пісьменнікаў не клапацілася аб рабоце рускіх паэтаў і празаікаў.

У сувязі з такім становішчам 18 студзеня быў склікан сход рускай секцыі. На сходзе сакратаром секцыі абран тав. Цітоў, таксама абрана рэдкалегія альманаха рускай секцыі і палос, арганізуемых газетамі. У склад рэдкалегіі ўвайшлі тт. В. Глазырын, А. Левіна і І. Гурэвіч.

Сходам намечан план работы секцыі на студзень і люты бягучага года.

С.

„АБ ШЛЯХАХ РАЗВІЦЦЯ СОВЕЦКАГА ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА"

У канцы студзеня ў Менск прыедзе вядомы мастак — засл. дзеяч мастацтваў праф. К. Ф. Юон. Праф. Юон прачытае лекцыю на тэму «Аб шляхах развіцця совецкага выяўленчага мастацтва», а таксама акажа неабходную дапамогу мастакам БССР у іх рабоце над карцінамі да выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці», прысвечанай 20-годдзю вызвалення БССР ад белапалякаў.

СКУЛЬПТУРНАЕ АДДЗЯЛЕННЕ У ВІЦЕБСКІМ МАСТАЦКІМ ВУЧЫЛІШЧЫ

Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР адкрывае ў Віцебскім мастацкім вучылішчы ў 1939—40 навуч. годзе скульптурнае аддзяленне. Дырэктару мастацкага вучылішча прапанавана запрасіць у якасці выкладчыкаў скульптурнага аддзялення кваліфікаваных мастакоў-скульптараў.

Адк. рэдактар І. ГУРСКІ.

Менск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку.

Уп. Галоўлітбела № Н—772